

НЕБЯСПЕЧНАЯ ДЭЗЫНФЕКЦЫЯ 11

ЯК ПРАЦУЮЦЬ ВЯСКОВЫЯ САЦРАБОТНІКІ? 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 ЧЭРВЕНЯ 2020 г. СУБОТА № 109 (29223)

З першых вуснаў

# «Венгрыя з'яўляецца самым блізкім для Беларусі партнёрам у Еўрасаюзе»



Фота БелТА.

## У фармаце жывой размовы Аляксандр Лукашэнка і Віктар Орбан абмеркавалі павышэнне тавараабароту ў два разы і стварэнне кааперацыйнай вытворчасці экалагічнага электратранспарту

**Сустрэча з прэм'ер-міністрам Венгрыі Віктарам Орбанам адкрыла фармат асабістых міжнародных сустрэч лідараў краін, перарваны каранцінам і пандэміяй. У парламенцкай рэспубліцы Венгрыя фактычна кіраўніком улады з'яўляецца прэм'ер-міністр. Таму сустракалі шаноўнага госця ў Палацы Незалежнасці адпаведна — аркестрам і ганаровай вартай. Сустрэча асаблівая яшчэ і таму, што гэты візіт кіраўніка ўрада Венгрыі ў Беларусь першы афіцыйны, але не першы ўвогуле. Віктар Орбан (аматар футбола) двойчы наведваў нашу краіну з прыватнымі візітамі ў якасці гледача беларуска-венгерскіх матчаў.**

### Не тая лічба

Але тэмы, закранутыя ўчора, былі далёкія ад спорту — тавараабарот, пашырэнне ўзаемадзеяння па лініі ЕС — ЕАЭС, наладжванне палітычных і эканамічных кантактаў.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, «Венгрыя — гэта краіна з вельмі высокім узроўнем развіцця і велізарным патэнцыялам. І той узровень нашых гандлёва-эканамічных, ды і палітычных узаемаадносін абсалютна не адпавядае таму, што мы можам».

СТАР. 2

КОРАТКА

- **Беларусь і ААН рыхтуюць рамачную праграму супрацоўніцтва на 2021—2025 гады.**
- У Беларусь прыбыла другая партыя гуманітарнай дапамогі з Польшчы.



- **Медыкам з прафсаюзнага страхавога фонду выплачана больш за Br500 тыс.**
- Беларускія нафтавікі прыступілі да праекта «Лічбавае радовішча».
- **У Палаце прадстаўнікоў разлічваюць на хуткі візіт аўстрыйскіх парламентарыяў у Беларусь.**
- Для выезду за мяжу тэсціраванне на COVID-19 можна прайсці платна ў Мінску.
- **Амаль 1 млн куб. м драўніны прадалі на квартальных біржавых таргах.**
- Мінэнерга Беларусі разлічвае на канструктыўны дыялог з РФ па супрацоўніцтве ў газавай сферы.
- **Імя пераможцы Міжнароднай Букераўскай прэміі назавуць 26 жніўня.**
- Францыя лічыць магчымым адкрыць межы Шэнгенскай зоны з 1 ліпеня.

Рэпарцёр

# ПЕРШЫ ЭКЗАМЕН — У ШТАТНЫМ РЭЖЫМЕ



**Карэспандэнт «Звязды» завітаў на цырымонію апошняга званка і пабываў на першых у жыцці экзаменах дзевяцікласнікаў. І ўсё — у сярэдняй школе № 17 Віцебска, якая функцыянуе, пачынаючы з 1928 года. Школьная тэрыторыя велічынёй з квартал. Тут мінулае пераклікаецца з сучаснасцю, атрымліваюць веды, пазнаюць свет каля 1000 маленькіх і юных гараджан. Невядома колькі яшчэ будзе, як той казаў, «правіць баль» COVID-19, але аніякай панікі з-за небяспекі «падчапіць» вірусы там не назіраецца. Ды і навошта хвалявацца? Усё ж прадугледжана дзеля захавання здароўя.**

### Адна на школу

Усе рэкамендацыі міністэрстваў адукацыі і аховы здароўя выконваюцца да дробязяў. А як жа інакш? Небяспечны вірус амаль не мае шанцаў распаўсюджвацца. Напрыклад, медык вымярае тэмпературу пры ўваходзе і кантралюе яе на працягу дня ў тых, хто можа выклікаць падазрэнне па медыцынскіх паказаннях... Чужых без масак і пальчатак далей хола каля ўвахода не пускаюць. І журналістам выключэння не робяць. Антысептык для рук на першым паверсе, як і ў класах. Прытрымліваюцца нормаў так званай сацыяльнай дыстанцыі. У гэтым выпадку на экзамене — за партай адзін вучань.

СТАР. 4

Работа для душы

# ХТО Б'Е Ў ЗВАНЫ

## Маладая жанчына стварыла ў Гродне школу званароў і рыхтуе кадры для храмаў



**Аваладаць даволі рэдкім рамяством можа кожны ахвотны. Праўда, людзі «з вуліцы» наўрад ці здолеюць затрымацца надоўга, бо набыць навыкі можа толькі той, хто скіраваны на цярпенне. Так лічыць прафесійны званар з 20-гадовым стажам Юлія МІНЧАНКА. Яна запрасіла карэспандэнта «Звязды» на званіцу і прадэманстравала свае майстэрства.**

### З чаго складаецца «аркестр»

Юлія ахвотна вядзе на вежу вышынёй каля 20 метраў. Гэта звыклы маршрут для яе — сюды яна падымаецца не толькі на работу, але і водзіць турыстаў. Свята-Пакроўскі сабор — аб'ект гістарычны, ён уваходзіць у многія турыстычныя маршруты. А гісторыя самага вялікага ў Гродне праваслаўнага храма налічвае больш за 100 гадоў. Пабудаваны ён у гонар воінаў, што гераічна змагаліся ў руска-японскай вайне 1904—1905 гадоў. Тады ж на вежы з'явіліся і званы, якія суправаджалі асвячэнне храма.

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

20109

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «Венгрыя з'яўляецца самым блізкім для Беларусі партнёрам у Еўрасаюзе»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Тавараабарот у 255 мільёнаў еўра — не тая лічба, якая павінна быць. ***«Нам трэба выкарыстоўваць усе магчымасці Венгрыі і Беларусі, каб пашырыць тавараабарот не толькі паміж нашымі краінамі, але і паміж дзвюма магутнымі эканамічнымі арганізацыямі: Еўрапейскім саюзам, з аднаго боку, і Еўразійскім эканамічным саюзам — з другога,*** — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Калі мы аб чымсьці дамовімся, Беларусь свята будзе выконваць гэтыя дамоўленасці».

## Самы блізкі з 27-мі

Учарашняя размова, як заявіў Аляксандр Лукашэнка журналістам па выніках сустрэчы, атрымалася вельмі канструктыўнай і паказала, што беларуска-венгерскае супрацоўніцтва знаходзіцца на ўздыме. Пацвярджэнне таму — і падабенства поглядаў па многіх актуальных праблемах.

«Венгрыя з'яўляецца самым блізкім для Беларусі партнёрам у Еўрасаюзе. Як ніхто іншы, разумее нас і спрыяе паглыбленню нашых адносін з Еўрапейскім саюзам. За апошнія гады яны значна палепшыліся, сталі больш прагматычнымі, раўнапраўнымі і, самае галоўнае, прадукцыйнымі. Вялікая заслуга ў гэтым нашых сяброў з Будапешта і асабіста Віктара Орбана, — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі. — ***Нашы краіны зацікаўлены ў развіцці Усходняга партнёрства як стваральнай ініцыятывы, арыентаванай на эканамічны рост. Прычым ініцыятывы, якая не парушае ні чыіх інтарэсаў».***

Беларусь гатовая да далейшага развіцця дыялогу ва ўзаемапаважлівым рэчышчы і на раўнапраўнай аснове ў рамках Паўночна-Атлантычнага альянсу, адносіны з якім становяцца ўсё больш давернымі.

**Тавараабарот Беларусі і Венгрыі ў 2019 годзе павялічыўся (у 1,3 раза) да 253,6 мільёна еўра. Склалася дадатнае для нашай краіны сальда ў 7,6 мільёна еўра. У першыя тры месяцы бягучага года гандаль таварамі дасягнуў амаль 51 мільёна еўра, адмоўнае сальда з нашага боку — 3,3 мільёна.**
**Летась амаль на 20 працэнтаў павялічаны і абарот паслуг. Найбольш папулярныя ў Венгрыі нашы транспартныя і камп'ютарныя паслугі. У студзені — сакавіку 2020-га гэта сфера ўклала ў сумесны тавараабарот 4,5 мільёна еўра (сальда дадатнае ў 3,4 мільёна). У Беларусі заснавана восем кампаній з венгерскім капіталам.**

Таксама абмяняліся палітыкі думкамі адносна ўрэгулявання сітуацыі на ўсходзе Украіны. «Канфлікт, які тлее там, з'яўляецца дэстабілізуючым фактарам еўрапейскай бяспекі і выклікам для ўсяго рэгіёна», — заявіў кіраўнік нашай краіны.

Венгрыя — блізкая Беларусі геаграфічна, гістарычна і культурна. Многія венгерскія брэнды шырока вядомыя ў нашай краіне. Пастаўлена задача, як запэўніў Аляксандр Лукашэнка, зрабіць, каб і брэнд «Зроблена ў Беларусі» стаў не менш папулярны ў Венгрыі.

Прыкладам эфектыўнага супрацоўніцтва ў прамысловасці можна назваць праект беларуска-венгерска-швейцарскай кааперацыі па вытворчасці электрацягнікоў «Штадлер». У Венгрыю пастаўлены выраблены ў Беларусі саставы, перш з іх ужо пратэсціраваны і хутка выйдуць на лінію.

«З улікам планаў Венгрыі па пераходзе на «зялёныя» тэхналогіі асабліва перспектыўнай бачыцца кааперацыя ў вытворчасці аўтобусаў, электробусаў, магчыма, і іншай тэхнікі. Пры ўзаемнай цікавасці ёсць усе магчымасці для выхаду на сумесныя маштабныя праекты», — канстатаваў беларускі лідар.

Аб'ядноўваюць краіны спробы вонкавага працідзеяння, якія яны адчуваюць пры рэалізацыі права на развіццё мірных ядзерных праграм. «Мы дамовіліся, што разам будзем даваць на іх адэкватны, але жорсткі адказ. ***Беларускі бок не дапусціць, каб хтосьці звонку спрабаваў уплываць на нашу энергетычную палітыку. Разам з тым мы гарантуем, што гэтая палітыка заўсёды будзе арыентавана на максімальную бяспеку, адкрытасць і празрыстасць»,*** — сказаў Прэзідэнт Беларусі і запэўніў, што мы гатовы прыняць экспертаў МАГАТЭ, ЕС, іншых міжнародных структур, каб яны пераканаліся ў тым, што атамная электрастанцыя ў Астраўцы не пагражае ні беларусам, ні суседзям.

Лідары краін пацвердзілі зацікаўленасць у абмене вопытам у ядзерна-энергетычнай сферы, эксплуатацыі АЭС, бяспечнага абыходжання з радыеактыўнымі адходамі і адпрацаваным ядзерным палівам.

Пра тое, што дзяржавы дамовіліся працягнуць узаемадзеянне ў розных шматбаковых фарматах, расказаў Прэзідэнт, адказваючы на пытанні журналістаў.

Эканамічным пытанням, па словах Аляксандра Лукашэнкі, прысвяцілі значную частку перагавораў, але больш падрабязнае іх абмеркаванне пакінулі ўраду. Ён лічыць рэальным і за два-тры гады павялічыць тавараабарот да паўмільярда еўра. «Мы завоблачныя лічбы не ставім. ***Пакуль неабходна дасягнуць 500 мільёнаў еўра тавараабароту. І мы будзем лічыць, што першы этап нашых інтэнсіўных кантактаў прынясе адчувальны эфект»,*** — падкрэсліў Прэзідэнт.

Выказаў Аляксандр Лукашэнка меркаванне пра ціск некаторых краін: «Пандэмія сапраўды шмат што зменіць. Але ціск не знікне. Мы павінны быць да гэтага гатовыя. Ціснуць будуць з усіх бакоў, і вытрымае толькі моцны. Моцны не толькі ў эканамічным, ваенным, палітычным дачыненні, але перш за ўсё ў маральных адносінах».

**Марыя ДАДАЛКА.**

### ❍ Каментарый у тэму

**Віктар ОРБАН: «Будаваць партнёрства санкцыямі немагчыма».**

Прэм'ер-міністр Венгрыі выказаў згоду з кіраўніком нашай краіны аб недастатковым узроўні ўзаемадзеяння: «Нашы палітычныя кантакты недастаткова шчыльныя. Мы мала размаўляем адзін з адным, і аб'ём эканамічнага супрацоўніцтва таксама дастаткова сціплы. Хоць мы ў Будапешце ведаем, што Беларусь развітая краіна. Мы заўсёды з вялікай павагай ставіліся да машынабудаўнічай і харчовай прамысловасці Беларусі. Мы высока цэнім культуру вашай краіны і спартыўныя дасягненні. Я вельмі спадзяюся, што наша сустрэча будзе абазначаць значны крок наперад. Я прыехаў са шчырымі намерамі аб супрацоўніцтве».

Дарэчы, Мінскі працэс ён лічыць адзінай надзеяй на вырашэнне сітуацыі ва Украіне.

Віктар Орбан паведаміў, што адзін з банкаў адкрыў крэдыт пад 40 мільёнаў еўра для сумесных беларуска-венгерскіх праектаў. Сума, магчыма, будзе павялічана.

Падтрымлівае краіна стратэгію Усходняга партнёрства, удзельнікам якой з'яўляецца Беларусь. «Тут мы кажам аб партнёрстве. Будаваць партнёрства санкцыямі немагчыма. Таму мы лічым, што для Еўрапейскага саюза наступіў момантануляваць існуючыя санкцыі ў адносінах да Рэспублікі Беларусь», — адзначыў Віктар Орбан.

**Больш падрабязна кірункі эканамічнага супрацоўніцтва Беларусі і Венгрыі Віктар Орбан абмеркаваў са сваім калегам Раманам Галоўчанкам**

На міжурадкамісіі ў маі і на ўчарашняй сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі, па словах Рамана Галоўчанкі, былі вызначаны парадак бліжэйшых праектаў і перспектыў для рэалізацыі ў двухбаковым узаемадзеянні.

«Вельмі правільна і добра, што гэта дарога з двухбаковым рухам: праекты, якія сёння знаходзяцца на стале, уключаючы, як прыцягненне, выкарыстанне беларускіх тэхналогій у Венгрыі ў такіх сферах як машынабудаванне, будаўніцтва, так і венгерскіх тэхналогій у Рэспубліцы Беларусь у сельскай гаспадарцы, фармацэўтыцы. Гэта вельмі збалансаваны падыход», — сказаў на сваёй першай міжнароднай сустрэчы ў новым статусе старшыня Саўміна.

Ён таксама адзначыў, што гэтыя двухбаковыя праекты моцна звязаны з павышэннем дабрабыту насельніцтва і спрыяюць занятасці грамадзян.

Парламенцкі дзённік

# Палітыка — на мір і стабільнасць

## У першым квартале ўзаемны тавараабарот паміж Беларуссю і Аўстрыяй павялічыўся на пяць працэнтаў

**Аб гэтым паведаміў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА падчас сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Аўстрыі ў Беларусі Алаізіяй ВЁРГЕТЭР. Уладзімір Андрэйчанка нагадаў, што папярэдняя сустрэча адбылася напярэдадні першага афіцыйнага візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Аўстрыю. Тады былі дасягнуты шэраг прынцыповых дамоўленасцяў у вобласці эканомікі, прамысловасці, сувязі.**

«Нават у гэтых няпростых умовах пандэміі за першы квартал узаемны тавараабарот паміж нашымі дзяржавамі ўзрос у дачыненні да першага квартала 2019 года на пяць працэнтаў. Важна, што ў рамках візіту наш Прэзідэнт сустрэўся са старшынёй Нацыянальнага савета Аўстрыі спадаром Саботкам. Мы лічым, што гэта новая старонка ў нашых міжпарламенцкіх адносінах», — працягнуў спікер Палаты прадстаўнікоў, запрасіўшы аўстрыйскіх дэпутатаў наведаць Беларусь.

Алаізія Вёргетэр адзначыла, што разуменне парламентарыямі Беларусі значна ўзрасло пасля адкрытага выступлення Аляксандра Лукашэнкі. І дзякуючы гэтаму Вольфганг Саботка настроены на далейшае развіццё адносін з Беларуссю.

У красавіку Вольфганг Саботка запрасіў Уладзіміра Андрэйчанку правесці двухбаковую сустрэчу ў ходзе V Сусветнай канферэнцыі спікераў парламентаў (19—21 жніўня 2020 года ў Вене). Уладзімір Андрэйчанка выказаў цвёрды намер прыняць удзел у рабоце канферэнцыі ў выпадку яе правядзення і гатоўнасць правесці такую сустрэчу.

«Нам ёсць аб чым сказаць, таму што палітыка Беларусі і ўнутраная, і знешняя накіравана на ўмацаванне міру, стабільнасці, узаемнага даверу», — звярнуў увагу старшыня Палаты прадстаўнікоў.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# Поле бою — даркнэт

## Новаўвядзенні ў заканадаўстве прадугледжваюць барацьбу з наркагандлем у кіберпрасторы

**Адпаведны законапраект разгледжаны на пасяджэнні другой сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі сёмага склікання. Як растлумачыў журналістам член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Ігар ЗАВАЛЕЙ, асаблівая ўвага аддаецца барацьбе з наркагандлем у кіберпрасторы — «даркнэце», дзе рэалізуюцца асноўныя аб'ёмы наркотыкаў.**

«Гэта ніша, у якой трэба працаваць разам, бо крыніцы, серверы знаходзяцца на тэрыторыі розных краін, і адна Беларусь з гэтым злом не справіцца», — падкрэсліў дэпутат.

Па яго словах, паколькі сучасны наркагандаль сышоў у кіберпрастору, асноўныя змяненні ў закон закрануць менавіта гэтыя від дзейнасці.

Дэпутат звярнуў увагу, што псіхатропныя рэчывы сёння часцей за ўсё — штучныя.

«Тут немалаважна вызначыць віды лабараторый: якія яны вырабляюць наркотыкі — і канцылядаваць намаганні па барацьбе. Пагадненне, прынятае ў 2000 годзе, састарэла і маральна, і тэхнічна, бо наркагандляры выйшлі на цалкам іншы ўзровень як у вытворчасці, так і ў рэалізацыі наркотыкаў», — упэўнены Ігар Завалей.

Пры гэтым ён адзначыў, што на тэрыторыі Беларусі вырабляюцца невялікія аб'ёмы наркотыкаў. Але праз наркатрафік частка забароненых рэчываў «асядае» ў нашай краіне. І гэта яшчэ адна прычына, чаму змагацца дзяржавы мусяць разам.

На пасяджэнні сесіі разгледжаны цэлы блок пытанняў сацыяльнай сферы.

«Асаблівая ўвага аддаецца мерам падтрымкі найбольш уразлівым катэгорыям грамадзян — сіротам, інвалідам, пенсіянерам, шматдзетным сем'ям. Шмат у гэтым кірунку ўжо зроблена», — заўважыў **намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Валерый МІЦКЕВІЧ** і адзначыў, што праекты новых законаў дазволяць стварыць дадатковыя ўмовы для актыўнага далучэння інвалідаў да ўсіх сфер жыццядзейнасці.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Блізкая ўлада

# НА СУВЯЗІ — ПАМОЧНІКІ ПРЭЗІДЭНТА

**Працягваецца практыка правядзення прамых тэлефонных ліній памочнікамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектарамі па абласцях і горадзе Мінску. Грамадзяне будуць мець магчымасць, не выязджаючы са свайго населенага пункта, звярнуцца па пытаннях, якія іх хвалююць, непасрэдна да прадстаўніка Прэзідэнта ў канкрэтным рэгіёне, а таксама давесці да яго свой пункт гледжання па тых ці іншых праблемах сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага характару.**

На наступным тыдні, **у аўторак, 9 чэрвеня, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Брэсцкай вобласці Анатоль Мечыслававіч МАРКЕВІЧ з 9 да 12 гадзін** будзе на прамой сувязі ў **Брэсцкім аблвыканкаме па тэлефоне (0162) 213121**, а **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль Канстанцінавіч ЛІНЕВІЧ з 10 да 12 гадзін** будзе прымаць званкі ў **Лёзненскім райвыканкаме па тэлефоне (02138) 51712**. **Памочнік Прэзідэнта — інспектар па горадзе Мінску Віталь Аляксандравіч ПРЫМА ў сераду, 10 чэрвеня,** будзе працаваць **з 9 да 12 гадзін у Адміністрацыі Партызанскага раёна сталіцы па тэлефоне (017) 3613616.**

На слыху

# ТЫМ, ХТО ВЫЯЗДЖАЕ ЗА МЯЖУ, ВАРТА ПРАЙСЦІ ТЭСЦІРАВАННЕ

**Па рэкамендацыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, краіны ЕС могуць прымаць турыстаў з краін з неспрыяльнай эпідэміялагічнай абстаноўкай, калі ў тых ёсць даведка аб стане здароўя. Міністэрства аховы здароўя інфармуе, што беларусы, якія выязджаюць за мяжу, могуць атрымаць такі дакумент. Для гэтага варта прайсці ПЛР-даследаванне, — у такім выпадку яно робіцца на платнай аснове.**

— Лабараторныя даследаванні на інфекцыю COVID-19 для грамадзян, якія выязджаюць за межы Беларусі ў краіны, што патрабуюць афіцыйнае пацвярджэнне адсутнасці інфекцыі, праводзіць Рэспубліканскі цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя. Тут праводзіцца лабараторнае тэсціраванне метадам палімеразнай ланцуговай рэакцыі (ПЛР) на платнай аснове, — паведамілі ў Міністэрстве аховы здароўя.

Кошт ПЛР-даследавання для грамадзян Беларусі складае 41,38 рубля, для нерэзідэнтаў — 56,63 рублі. Тым, хто жадае прайсці тэсціраванне, неабходна мець з сабой копію пашпарта і копіі білетаў у тую краіну, куды выязджаюць. Пасля тэсціравання на COVID-19 выдаецца вынік лабараторнага даследавання на рускай і англійскай мовах.

### Даследаванне адклікалі

Даследаванне аб шкодзе выкарыстання гідраксіхларахіну (прэпарат для лячэння малярыі, які выкарыстоўваецца пры каранавіруснай інфекцыі) адклікана.

Аўтары аналізу гідраксіхларахіну, апублікаванага ў аўтарытэтным медыцынскім часопісе The Lancet, і даследавання сардэчна-сасудзістых хвароб у Медыцынскім часопісе Новай Англіі адклікалі абодва даследаванні. У прыватнасці, у іх сцвярджалася, што прэпарат можа наносіць хвораму шкоду і нават выклікаць смерць пацыента. Пасля таго як незалежныя рэцэнзенты не змаглі праверыць ключавыя даныя кампаніі, што прадставіла даследаванне, аўтары былі вымушаны адклікаць артыкулы. Сусветная арганізацыя аховы здароўя аднавіла дазвол на правядзенне тэсціравання гідраксіхларахіну як лекавага сродку пры COVID-19.

У Беларусі гэты прэпарат таксама выкарыстоўваецца ў схеме лячэння каранавіруснай інфекцыі. **Галоўны пазаштатны спецыяліст Міністэрства аховы здароўя па інфекцыйных хваробах Ігар КАРПАЎ** адзначыў, што хоць публікацыя і была адклікана, яна паслужыла сігналам для ўзмацнення кантролю пры лячэнні пацыентаў хларахінам і гідраксіхларахінам. Дарэчы, пільны маніторынг за станам пацыентаў пры яго прымяненні праводзіўся з першых назначэнняў.

— На вопыце выкарыстання гэтага прэпарату складваецца станоўчае ўражанне. Гэта датычыцца як паляпшэння самаадчування, так і лабараторных паказчыкаў. Па меры назапашвання даных будуць уносіцца пэўныя карэктывы. А цяпер актуальным застаецца маніторынг стану пацыентаў, якія атрымліваюць гэтыя лекавыя сродкі, — адзначыў Ігар Карпаў.

***Па звестках на 5 чэрвеня, у Беларусі 46 868 выпадкаў COVID-19. З іх паправіліся і выпісаны 22 066 пацыентаў, памерла 259 чалавек. Праведзена 597 013 тэстаў. За апошнія суткі выяўлена 887 новых інфіцыраваных, пры гэтым выпісана 904 чалавекі, якія паправіліся. Трэці дзень запар колькасць тых, хто выпісаны, перавышае лічбу новых інфіцыраваных. Шэсць пацыентаў за апошнія суткі выратаваць не ўдалося.***

**Алена КРАВЕЦ.**

**❍ Даслоўна**

**Іна КАРАБАН, намеснік начальніка аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя:**

«З прыходам лета людзі самазаспакоіліся. Разам з тым вірус працягвае цыркуляваць, пра гэта трэба памятаць. Ва ўсіх месцах масавага збору людзей (метро, крамах, грамадскім транспарце, банках і г. д.) абавязкова насіць маскі і выконваць меры сацыяльнага дыстанцыявання. На адкрытым паветры (напрыклад, у парках, скверах), дзе ёсць магчымасць сацыяльна дыстанцыявацца, нашэнне масак немэтазгоднае».

# Дзікаросы паміж тратуарных пліт

## Акцыю «Крэйдавая батаніка» запусцілі ў Сусветны дзень навакольнага асяроддзя

**Беларусы падхапілі ініцыятыву еўрапейскіх батанікаў, і цяпер на сталічных вуліцах з'явіліся подпісы з назвамі раслін, што растуць на ўзбочынах і паміж тратуарных пліт. Валанцёры грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) хочуць перадаць эстафету далей, каб «крэйдавай батанікай» захапіліся і рэгіёны.**




Адным з заснавальнікаў незвычайнай ініцыятывы лічыцца французскі батанік Барыс Прэсэк, які летась пачаў падпісваць крэйдай назвы гарадскіх раслін для таго, каб людзі ўсвядомілі прысутнасць дзікай расліннасці, зацікавіліся ёй і пачалі ставіцца да яе з павагай.

Запуск акцыі ў Беларусі прымеркаваны да Сусветнага дня аховы навакольнага асяроддзя, які адзначаецца 5 чэрвеня. Акцыя — добрая нагода, каб спыніцца і звярнуць увагу на прыгажосць нашых раслін, даведацца пра іх ролю ў нашым жыцці. У сталіцы расце каля 400 (!) відаў абарыгеннай флоры, уключаючы каля 19 раслін з Чырвонай кнігі. У Мінску надпісы крэйдай ужо з'явіліся на выхадзе са станцыі метро «Няміга», на Кастрычніцкай вуліцы, на Камароўцы, каля завода «Прамень» і ў іншых месцах.

Старшы навуковы супрацоўнік Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН Беларусі Аркадзь Скуратовіч кажа: «Сярод самых распаўсюджаных дзікіх раслін у Мінску, якія дастаткова лёгка адрозніць, можна назваць метлюжок аднагадовы, васілёк сіні, дзьмухавец лекавы, стрэлкі, крынічнік дуброўны, крываўнік. Зараз пачаў квітнець прыгожы злак — дрыжнік. Каля Свіслачы можа сустрэцца лісахвост звычайны, абапал дарожак — мяшэй, а на пустках, сметніках і каля хмызоў растуць крапіва і сардэчнік».

Каб стаць удзельнікам акцыі, падпісвайце знаёмыя вам расліны крэйдай па-беларуску ці па-руску, дадавайце хэштэг #расліныгорада і змяшчайце фота з надпісам да расліны з гэтым жа хэштэгам у сваіх сацсетках! Калі вам цяжка вызначыць расліну, скарыстайцеся вызначальнікамі, мабільнай праграмай plantsnap або спытайце ў знаёмых.

Акцыя праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Ахова птушак Бацькаўшчыны» ў партнёрстве з Інстытутам эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН Беларусі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны».**

Фінансы

# НАШЫ РЭЗЕРВЫ — АМАЛЬ 8 МЛРД ДОЛАРАЎ

**Паводле інфармацыі прэс-службы Нацыянальнага банка нашай краіны, золатавалютныя рэзервы Беларусі па стане на 1 чэрвеня склалі 7 879,3 млн долараў ЗША (у эквіваленце).**

Такім чынам, міжнародныя рэзервовыя актывы за май знізіліся на 3,7 млн долараў (на 0,05 %) пасля росту ў красавіку на 96,4 млн долараў (на 1,2 %). Адмоўны ўплыў на аб'ём золатавалютных рэзерваў у маі аказала планавае пагашэнне ўрадам і Нацыянальным банкам знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце на суму каля 220 млн долараў.

Падтрыманню ўзроўню золатавалютных рэзерваў у маі спрыялі купля замежнай валюты Нацыянальным банкам на таргах ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа», паступленне замежнай валюты ў бюджэт, у тым ліку ад продажу Міністэрствам фінансаў аблігацый, намінаваных у замежнай валюце, а таксама рост кошту манетарнага золата.

Згодна з асноўнымі кірункамі грашова-крэдытнай палітыкі на 2020 год аб'ём міжнародных рэзервовых актываў на 1 студзеня 2021 года павінен скласці не менш за 7,3 млрд долараў.

# ЛЮБЫ БАНКАМАТ СТАНЕ СВАІМ

**Банк Дабрабыт даў пажылым людзям магчымасць бясплатна здымаць наяўныя грошы ў банкаматах іншых банкаў. Зроблена гэта з клопатам пра пенсіянераў, каб тыя маглі выкарыстоўваць найбліжэйшыя да дома тэрміналы любога банка.**

Камісіі не спаганяюцца па пенсійных картках. Уладальнікі такіх «пластыкаў» могуць бясплатна атрымаць наяўныя грошы ў любым банкамаце краіны. Сума і колькасць аперацый неабмежаваныя.

Аналітыкі банка высветлілі, што менавіта многія немаладыя людзі аддаюць перавагу наяўным, так што фінансісты і вырашылі вызваліць іх ад цяжару пошуку патрэбнага банкамата.

«Для нас было важна паклапаціцца аб пенсіянерах і спрасціць ім жыццё. Як правіла, яны актыўна карыстаюцца банкаматамі, так што для іх актуальная магчымасць здымаць наяўныя побач з домам. Самы просты спосаб гэта забяспечыць — не спаганяць камісію ў банкамаце любога банка, што мы і зрабілі. Гэта і фактар зручнасці, і элемент клопату пра здароўе пажылых людзей», — тлумачыць прэс-сакратар банка Аляксей Раманчук.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Удзельнікі саміту па вакцынацыі сабралі $8,8 млрд



Гэтыя сродкі прызначаны на фінансаванне Глабальнага альянсу па вакцынацыі і імунізацыі (GAVI) на перыяд з 2021 да 2025 года. Першапачаткова планавалася сабраць каля $7,4 млрд. Сустрэча прайшла ў фармаце відэаканферэнцыі. $1,6 млрд альянсу выдзеліў Фонд Біла і Мелінды Гейтс, €300 млн паабяцала Еўракамісія. Таксама сродкі выдзелілі Германія, Францыя, Нідэрланды, Італія, Швецыя, Вялікабрытанія, Японія, Саудаўская Аравія, Катар, Аўстралія. Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш заклікаў да «глабальнай салідарнасці, каб гарантаваць, што любы чалавек у любым месцы будзе мець доступ да прышчэпак». Паводле яго слоў, вакцына супраць COVID-19 «павінна ўспрымацца як глабальны грамадскі здабытак». У маі многія краіны свету далучыліся да анлайн-кампаніі — Global Response — па зборы сродкаў на распрацоўку вакцыны ад каранавіруса. Яе арганізатарамі выступілі восем краін (Вялікабрытанія, Германія, Італія, Канада, Нарвегія, Саудаўская Аравія, Францыя і Японія) пры падтрымцы СААЗ і профільных альянсаў GAVI і CEPI (Кааліцыя за інавацыі ў сферы эпідэмічнай гатоўнасці). Цяпер сабрана звыш €9,8 млрд.

## Меркель пацвердзіла адмову ад планаў працягваць работу канцлерам



Канцлер ФРГ Ангела Меркель заявіла, што дакладна не будзе спрабаваць застацца на сваёй пасадзе на пяты тэрмін. Аб гэтым яна паведаміла тэлекампаніі ZDF. Канцлер ФРГ падкрэсліла, што цвёрда прыняла такое рашэнне. У Германіі больш чым 70 працэнтаў грамадзян заявілі, што задаволены работай Ангелы Меркель на пасадзе, адзначае тэлеканал ARD. Яе рэйтынг узрос на фоне сітуацыі з каранавірусам, па ФРГ ён ударыў не так моцна, як па іншых еўрапейскіх краінах. У канцы 2020 года ў партыі Хрысціянска-дэмакратычны саюз павінны адбыцца выбары старшыні, яны былі адкладзены з красавіка з-за ўспышкі COVID-19. Раней гэтую пасаду займала Анегрэт Крамп-Карэнбаўэр, якая лічылася пераемніцай Меркель, але ў лютым яна падала ў адстаўку. Выбары канцлера ФРГ намечаны на восень 2021 года.

## Апублікавана раней невядомае апавяданне Хэмінгуэя



Апавяданне змешчана ў часопісе New Yorker. Гісторыя называецца «Пагоня як шчасце». У апавяданні галоўны герой па імені Эрнэст разам з сябрамі спрабуе злавіць вялізнага марліна. Сюжэт пераклікаецца з падзеямі аповесці «Стары і мора», упершыню выдадзенай у 1952 годзе. Унук пісьменніка Шон знайшоў рукапіс у бібліятэцы і музеі Джона Ф. Кенэдзі ў Бостане. Ён датаваў апавяданне паміж 1936-м і 1956 гадамі. «Магчыма, гэтая гісторыя была натхнёная рыбалкай летам 1953-га. Там сышлося некалькі падзей. І аўтар дадаў у гісторыю некалькі элементаў выдумкі», — расказаў унук пісьменніка.

# ПЕРШЫ ЭКЗАМЕН — У ШТАТНЫМ РЭЖЫМЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Калі працяглы экзамен, праз дзве гадзіны праводзіцца дэзынфекцыя памяшкання: кантактныя паверхні праціраюцца антысептыкам.

Паводле слоў **дырэктара Сяргея БАГАМОЛАВА**, быў выяўлены адзін выпадак захворвання. Вучаніца дзясятага класа прыйшла ў школу, дрэнна сябе адчувала. Дзяўчынка была аператыўна ізалявана. Як і праведзены ўсе неабходныя мерапрыемствы: ва ўсіх магчымых кантактаў аналізы не пацвердзілі заражэння.

Дарэчы, на ўрачыстай лінейцы, прысвечанай заканчэнню навучальнага года, не было, як прынята па традыцыі, хвалюючых імгненняў, калі выпускнік трымае на руках дзяўчынку-першакласніку са званком у руках. Толькі былі выпускнікі, бацькі і некаторыя настаўнікі. Дык і добра!

Такім чынам, чуткі пра тое, што кагосьці ледзь не сілай зацягваюць у школы для масавасці — перабольшванне.

Ці многа хадзілі да экзаменаў? Як паведамілі педагогі, больш за палову хлопчыкаў і дзяўчынак наведвалі школу. А сярод тых, каму трэба было здаваць экзамены, хадзілі на занятки каля 70 %. Астатнія — мелі стасункі з выкладчыкамі і атрымлівалі заданні і адпраўлялі адказы па электроннай пошце. Усю неабходную інфармацыю з тлумачэннямі размясцілі на сайце ўстановы адукацыі.

## Пра пандэмію... географ

Сёлета ў школе 55 выпускнікоў, якія вучыліся адзінаццаць гадоў. І 40 — пасля дзявятага класа, якія вырашылі далей вучыцца па-за школай.



Яшчэ 30 застануцца тут далей атрымліваць веды...

У ліку тых, хто пакідаюць сцены школы, сем медалістаў. А 11-класніца Насця Палушына пераможца рэспубліканскай алімпіяды па геаграфіі. Дзяўчына нават амаль не пакрыўдзілася, калі я правакацыйна сказаў, што яе любімы прадмет не ў трэндзе. А вось замежная мова і ўсё, што звязана з камп'ютарам, крута! Уразмоўніца пачала расказваць пра сацыяльную геаграфію і яе актуальнасць падчас пандэміі, ды і па-за ёю. Нюансы распаўсюджвання: чаму менавіта так было, а не інакш, іншыя дробязі, якія цікавяць сёння ўсіх, — яе навука адкажа на гэта і многія актуальныя пытанні. А галоўнае, маючы добры аналіз інфармацыі, можна прадухіліць «распаўзанне» па свеце чагосьці небяспечнага для ўсяго чалавецтва.

А для дзевяцікласніцы Насці Закрэўскай сёлета першыя выпрабаванні па вучобе. Заразіцца, прызналася, у школе не баіцца, а вось дрэнна здаць экзамены — так! Гутарылі з ёй да экзамену па матэматыцы, дзяўчынка сказала, што для яе гэты прадмет, у адрозненне ад таксама экзаменацыйных рускай і беларускай моў, самы цяжкі. Пасмяялася з маіх успамінаў, што клалі пад падушку кніжку ў ноч перад экзаменам. Каб лепш у галаву веды «пераходзілі». Сказала, што смартфон або планшэт з адказамі на білеты лепш паклацці далей ад ложка. Найлепшая падмога — добрае разуменне таго, што трэба будзе адказаць. Побач стаяў яе тата, які часта бывае ў школе, бо дапамагае ў арганізацыі розных мерапрыемстваў як гукааператар. Казаў, што зроблена ўсё магчымае, каб дзеці не сталі ахвярамі каварнага віруса. Сам жа ходзіць па калідорах і гэтак далей, дзе і дачка. І гаворыць не для прыгожага слаўца, са здароўем дзяцей не жартуюць.

Настаўнік Наталля Лядэнка, класны кіраўнік 9 «Б» у гэтай жа школе працавала яшчэ студэнткай. І з таго часу нідзе больш. Гэта яе шосты выпуск (вучняў, якія сыходзяць са школы). Кажа, што, канешне, пандэмія змяніла падыход да атрымання ведаў. Але няхай і дыстанцыйна, падлеткі вучыліся адказна. Большасць прыходзілі на заняткі, па суботах — на індывідуальныя.

## Гонар школы

Пакуль падлеткі здавалі экзамены, дырэктар запрасіў на экскурсію ў школьны музей народнага гонару, якому прыкладна трыццаць гадоў. Стварылі яго, калі школу ўзначальвала Ірына Шаўчэнка. Яна зацікавіла папаўненнем фонду калег, дзяцей і іх сваякоў. І традыцыяй стала дарыць тое, што можа стаць часткай экспазіцыі: значкі, паштоўкі, маркі...

Тут ёсць і археалагічныя знаходкі, «рэха вайны»: гільзы, пляшкі, элементы формы і іншае. Цікава прачытаць на стэндах пра былых вучняў.

Як адзначыў дырэктар школы, у наш час назіраецца цікавы «феномен». У школе працавалі або вучыліся нямала кіруючых асоб. Сярод іх і кіраўнік абласнога парламента Уладзімір Цярэнцьеў. Многія былыя вучні памятаюць яго як вельмі ініцыятыўнага педагога-арганізатара. Сярод выхадцаў і дэкан аднаго з факультэтаў Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, кіраўнікі сістэм адукацыі гарадскога і раённага ўзроўняў.

Музей адзін з нямногіх віцебскіх школьных мае званне «народнага». У «гасцявой кнізе», дзе наведвальнікі могуць падзяліцца ўражаннямі, ёсць і ўдзячнасць ад грамадзянкі Швейцарыі. Не, яна не наша былая, а, як кажуць, «чыстакроўная швейцарка». Жанчына была назіральніцай на парламенцкіх выбарах, якія адбыліся мінулай восенню. Школьнікі запрасілі яе да сабе ў музей. Іншаземка была вельмі ўражана не толькі ўбачаным, але і расказамі пра цір, басейн, майстэрні, дзе хлопчыкі вучацца сталярнай справе, а дзяўчаты — шыццю. І пра ўсё гэта і іншае ёй расказалі на англійскай мове.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Спорт

# ЯРКАЯ ПАДЗЕЯ ЛЕТНЯГА СЕЗОНА

### Чэмпіянат Беларусі па лёгкай атлетыцы пройдзе ў перыяд з 31 ліпеня да 2 жніўня на стадыёне «Дынама»

**Турнір адбудзецца ў фармаце класічнай лёгкай атлетыкі, акрамя наймацнейшых беларускіх атлетаў, не выключана, што на старце ў Беларусі выступяць і спартсмены з іншых краін. «Нам наўрад ці ўдасца перадаць атмасферу Алімпійскіх гульняў, але мы хочам для спартсменаў і гледачоў зрабіць шоу. Думаю, чэмпіянат краіны стане яркай падзеяй летняга сезона», — адзначыў старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ. Ён дадаў, што чэмпіянат Беларусі дасць неабходны спаборніцкі вопыт спартсменам і магчымасць выразіць свае эмоцыі на стадыёне. Спаборніцтвы стануць добрай магчымасцю паглядзець, у якой форме знаходзяцца беларускія атлеты.**

Арганізатары абяцаюць здзівіць не толькі спартыўнымі вынікамі, але і шоу, усё будзе пабудавана вакол беларускай мовы і традыцый: пачынаючы ад прэзентацый і нумароў і заканчваючы цырымоніяй узнагароджання. Напрыклад, усім ахвотным будзе дадзена магчымасць прабегчы па дарожках стадыёна, кінуць бульбу падчас жартоўных конкурсаў, патрымаць у руках сапраўдныя лёгкаатлетычныя снарады. Забаўляць гасцей будзе прадстаўлены напярэдадні талісман Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі — Бафік. Кошт білета абяцаюць зрабіць цалкам сімвалічным: два рублі для дарослых і рубель — для дзяцей. Лёгкаатлетычныя школы сваіх выхаванцаў змогуць адправіць на стадыён бясплатна. Пры гэтым, падкрэслівае Вадзім Дзевятоўскі, спартыўны складнік падзеі таксама будзе на высокім узроўні.

— Кардынальных новаўвядзенняў не будзе: нас чакае класічная лёгкая атлетыка, спаборніцтвы ў знаёмым фармаце. Хіба што ў раскладзе з'явіцца мнагабор'е, а спартыўная хадзьба пройдзе на стадыёне — дыстанцыі 5000 і 10 000 метраў. Але мы ўсё ж хочам зрабіць падзею асаблівай. Нам важна праверыць, у якім стане знаходзяцца вядучыя спартсмены, якія працягвалі падрыхтоўку ўсе гэтыя месяцы. Для кожнага былі распрацаваны персанальныя стратэгіі, але пандэмія ўнесла карэкціроўкі ў графік работы і запланаваныя зборы. Мы не кажам, што на чэмпіянаце краіны трэба любой цаной паказаць алімпійскія вынікі. Хтосьці, наадварот, паўзу ў спаборніцтвах выкарыстоўвае для аднаўлення. Але для тых, хто знаходзіцца на хаду, галоўны ўнутраны турнір павінен стаць чымсьці накшталт кантрольнай работы і магчымасці рэалізаваць назапашаны патэнцыял.

Нагадаем, 74 беларускія атлеты, якія прадстаўляюць 16 відаў спорту, выканалі кваліфікацыйныя патрабаванні і нарматывы, якія даюць права выступіць на Алімпіядзе ў Токіа. Пасля аднаўлення адборачных спаборніцтваў беларусы маюць намер завяваць яшчэ некалькі дзясяткаў алімпійскіх квот.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Здарэнні

## ПАЦЯРПЕЛІ ПРЫ ПЕРАВОЗЦЫ ХЛОРУ

**У выніку ўцечкі спатрэбілася дапамога ратавальнікаў, паведамляе МНС.**

Ранкам у службу «112» паступіла паведамленне аб уцечцы невядомага газу каля вёскі Стоневічы Іўеўскага раёна. Па папярэдніх звестках, мужчына разам са знаёмым ехалі на аўтамабілі для здачы металалому ў прыёмны пункт. У нейкі момант яны адчулі з'едлівы пах, які зыходзіў з прычэпа, усярэдзіне якога знаходзіліся пяць металічных балонаў з невядомым змесцівам.

Пасля гэтага яны з'ехалі з дарогі ў лясны масіў каля вёскі Стоневічы і спыніліся, адчапіўшы прычэп. Затым мужчыны выявілі ўцечку неўстаноўленага газу з балона, пасля чаго паведамілі аб гэтым па тэлефоне 112. Ратавальнікі правялі абследаванне месца здарэння і асадзілі аблокі распыленай вадой. Аддзяленнем хіміка-радыяцыйнай абароны МНС было вызначана, што ўнутры балонаў знаходзіцца хлор.

Работнікамі МНС пашкоджаны балон быў змешчаны ў металічную ёмістасць з вадой. Ён і яшчэ чатыры іншыя будуць дастаўлены на склад часовага захоўвання ў раённы філіял «Азот-агра». Пагрозы для насельніцтва няма. Адзін з мужчын, адчуўшы недамаганне і галавакружэнне, звярнуўся па дапамогу да медыкаў. Пасля агляду ўрачамі быў шпіталізаваны.

## МЫЎ АКНО І ВЫПАЎ

**Здарэнне адбылося раніцай у адным са шматпавярховікаў па вуліцы Блахіна ў Наваполацку.**

Паводле папярэдняй інфармацыі, пенсіянерка папрасіла суседа дапамагчы памыць вокны на балконе, паколькі сама яна баіцца вышыні. Мужчына адгукнуўся на просьбу і разам са сваёй сяброўкай прыйшоў на дапамогу.

У працэсе работы навапалачанін 1984 года нараджэння, трымаючыся за аконную раму, высунуўся на вуліцу. Канструкцыя аказалася нетрывалай і выпала разам з ім з пятага паверха на асфальт. Са шматлікімі цяжкімі траўмамі мужчына быў шпіталізаваны ў рэанімацыйнае аддзяленне гарадской бальніцы.

Наваполацкім ГАУС па гэтым факце праводзіцца праверка, устанаўліваюцца ўсе абставіны здарэння.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ПРАБЛЕМ З ПЕНСІЯЙ БУДЗЕ МЕНШ

### Беларусь і Польшча — за супрацоўніцтва ў галіне пенсійнага забеспячэння

**Беларусь і Польшча будуць прызначаць пенсіі за стаж, набыты ў адпаведнасці з заканадаўствам на іх тэрыторыі. Выплата пенсіі, прызначанай беларусу ў Польшчы, калі ён пераедзе на радзіму, будзе праводзіцца ў Беларусі. І наадварот: калі беларус на пенсіі пераедзе жыць у Польшчу, наша дзяржава будзе перасылаць яму яго пенсію па месцы жыхарства.**

У пачатку чэрвеня было падпісана Адміністрацыйнае Пагадненне аб парадку прымянення Дагавора паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча аб сацыяльным забеспячэнні ад 13 лютага 2019 года. Гэты дагавор заснаваны на прапарцыйным прынцыпе, які прадугледжвае прызначэнне пенсіі дзяржавай, на тэрыторыі якой працякала работа і выплачваліся пенсійныя ўзносы.

Акрамя пенсійнага пытання, згаданы дагавор дазваляе рэгуляваць і многія іншыя аспекты, звязаныя з працоўнай дзейнасцю. Так, у Беларусі ён будзе прымяняцца да заканадаўства, якое датычыцца выплаты ўзносаў на абавязковае дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне; дапамог па беспрацоўі, часовай непрацаздольнасці і мацярынстве, на пахаванне; працоўных пенсій (па ўзросце, з прычыны страты карміцеля, за выслугу гадоў); аднаразовай і штомесячных страхавых выплат па абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў.

У Польшчы палажэнні дагавора будуць улічвацца пры прызначэнні беларусам дапамог па беспрацоўі, дапамог на пахаванне, а таксама ў пытаннях сацыяльнага страхавання і сацыяльнага страхавання фермераў; пры прызначэнні выплат у сувязі з хваробай і мацярынствам; пенсій, рэнты па непрацаздольнасці і сямейнай рэнты; выплат у сувязі з няшчасным выпадкам на вытворчасці і прафесійным захворваннем.

Але, як адзначаюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны Беларусі, палажэнні гэтага дагавора ў Беларусі не будуць прымяняцца ў дачыненні да пенсійнага забеспячэння ваеннаслужачых і прыраўнаваных да іх асоб, а таксама членаў іх сем'яў.

Пакуль што гэты дагавор ратыфікаваны толькі ў нашай краіне і ў сілу яшчэ не ўступіў. Ён пачне дзейнічаць з першага дня трэцяга каляндарнага месяца, наступнага за месяцам атрымання апошняга пісьмовага паведамлення аб выкананні дзяржавамі ўнутрыдзяржаўных працэдур, неабходных для яго ўступлення ў сілу.

**Святлана БУСЬКО.**

Класныя навіны

# НЕРАЎНАДУШНЫЯ, АКТЫЎНЫЯ І СМЕЛЫЯ

**Заяўкі на праект «Настаўнік для Беларусі» падалі 125 педагогаў і 70 навучальных устаноў. Іх прыём завяршыўся 25 мая.**

— За ўвесь час рэкрутынгавай кампаніі мы запрасілі 25 чалавек узяць удзел у нашым Летнім інтэнсіве, — расказала адна з **каардынатараў праграмы Алена МЕЛЬЧАНКА.** — Але гэта яшчэ не канец! Адборы працягнуцца ў наступныя выхадныя.

Размова ідзе пра сумесны праект БПС-Ашчадбанка і Міністэрства адукацыі, мэта якога — прыцягнуць у школы ў невялікіх гарадах і населеных пунктах крэатыўных і неабыякавых настаўнікаў, якія хочуць і могуць прыўнесці ў сваю прафесію новыя цікавыя ідэі, умеюць спраўляцца з цяжкасцямі, захоўваючы аптымізм, імкнуцца да самаразвіцця, гатовыя да змен (у тым ліку і да пераезду на новае месца) і вераць у свае сілы.

Для таго каб найбольш аб'ектыўна падысці да выбару будучых удзельнікаў «Настаўніка для Беларусі», камандай праекта з прыцягненнем спецыялістаў па падборы персаналу была распрацавана «Мадэль кампетэнцый», якая грунтуецца на місіі і каштоўнасцях праекта і акумулюе ў сабе вопыт аналагічных праграм па ўсім свеце.

— Летні інтэнсіў — гэта частка адукацыйнай праграмы і апошні этап нашага адбору, — тлумачыць Алена Мельчанка. — Не выключана, што хтосьці зразумее, што яму нічога не хочацца змяняць у сваім жыцці, — мы да такога ходу падзей таксама падрыхтаваныя, у кандыдатаў пакуль няма ніякіх абавязацельстваў перад намі. А ўсім, хто паспяхова пройдзе інтэнсіў, мы зробім прапанову па ўдзеле у праграме. Да таго ж трэба яшчэ, каб магчымасці і жаданні нашых кандыдатаў супалі з вакансіямі ад школ, бо ў кожную навучальную ўстанову мы накіроўваем сама меней па два ўдзельнікі, і гэта няпростая лагістычная задачка са многімі зменнымі. Як сведчаць заяўкі, што паступілі на праект ад школ, самыя запатрабаваныя там настаўнікі матэматыкі, пачатковых класаў, замежных моў і фізікі.

Летась для ўдзелу ў праграме «Настаўнік для Беларусі» былі абраныя дзевяць настаўнікаў, якія на два гады адправіліся працаваць у школы ў Кобрынскім (аграгарадок Павіцце), Бярэзінскім (Паплаўскі дзіцячы сад — сярэдняя школа), Чэрвеньскім (Лядзенскі дзіцячы сад — сярэдняя школа) раёнах, у гімназію ў Дзяржынску і Негарэльскую сярэднюю школу № 1.

Новым удзельнікам праграмы абяцаюць куратарскую, праектную, метадычную і матэрыяльную падтрымкі. Акрамя заработнай платы, выплачваецца таксама стыпендыя за дадатковую нагрузку па рэалізацыі праектаў, да таго ж кожны з іх забяспечваецца для зручнасці работы ноўтбукам.

Удзельнік сам выбірае і прапрацоўвае праект, які ён будзе рэалізоўваць. Гэта можа быць любая ініцыятыва — ад арганізацыі фестывалю кнігі да стварэння школьнага радыё і распрацоўкі экскурсійных маршрутаў. Абавязковая ўмова — ініцыятыва павінна арыентавацца на развіццё мясцовай супольнасці.

Таксама фонд «Новая школа» кампенсуе ўдзельнікам праграмы выдаткі на арэнду жылля пры пераездзе.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Нясумнае лета

# Валанцёры запрашаюць у... анлайн-лагер

**Амаль 23 тысячы падлеткаў і маладых людзей плануюць працаўладкаваць гэтым летам органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.**

— Штогод мы праводзім арганізацыйную работу па аказанні садзейнічання ў працаўладкаванні моладзі ў вольны ад вучобы час, — расказала падчас сустрэчы з журналістамі ў Грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы **кансультант упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Жанна ШЧАМЯЛЁВА.** — Заключаюцца дагаворы, вызначаюцца віды работ і памер фінансавання. У 2020 годзе моладзь пераважна будзе займацца азеляненнем і добраўпарадкаваннем тэрыторыі навучальных устаноў і ўстаноў сацыяльнай абароны, рамонтам вучэбнай мэблі, рэстаўрацыяй кніжнага фонду, гэта значыць, тымі відамі работ, што дазволены заканадаўствам у пэўным узросце. Школьнікі сярод працаўладкаваных займаюць 85 працэнтаў — гэта асноўны наш кантынгент. Таксама падзарабіць змогуць навучэнцы сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, прафтэхустаноў і ВНУ.

На гэтыя мэты было выдзелена амаль шэсць мільёнаў рублёў, у тым ліку на зарплату для маладых людзей.

На сённяшні дзень органамі па працы заключана 697 дагавораў з наймальнікамі на працаўладкаванне моладзі. За студзень—май ужо амаль чатыры тысячы чалавек з ліку моладзі працавала ў вольны ад вучобы час.

Часовая занятасць моладзі арганізуецца ва ўсіх рэгіёнах. Дарэчы, ёсць і тыя наймальнікі, якія гатовыя прыняць дзяцей на работу за свае сродкі — такое пажаданне выказала 131 арганізацыя. У іх ліку «Белпошта», «Белсаюздрук», гандлёвыя арганізацыі, лягасы, аграгаспадаркі, ЖКГ і іншыя.

Для таго каб працаўладкавацца, трэба звярнуцца ў тэрытарыяльную службу занятасці: там хлопцам і дзяўчатам дапамогуць вызначыцца з выбарам работы на летні перыяд.

Кіраўнік Рэспубліканскага валанцёрскага цэнтра Наталля Апанчук паведаміла, што 6 ліпеня для дзяцей і моладзі запусцяць летні анлайн-лагер. Гэта была ініцыятыва саміх валанцёраў. У ім могуць прыняць удзел дзеці і падлеткі ва ўзросце ад 12 да 15 гадоў. Усяго запланаваны чатыры летнія змены па 30 дзяцей у кожнай.

«Гэта эксперыментальны праект, спадзяёмся, што налета ён будзе ўжо больш маштабны, — канстатавала Наталля Апанчук. — Над праграмай ужо працуюць восем валанцёраў. Астатніх анлайн-важатых пачнуць набіраць з 8 чэрвеня. Найлепшыя будуць адабраны па выніках сумоўя».

Рэгістрацыя саміх школьнікаў для ўдзелу ў змене стартуе пазней. Інфармацыя з'явіцца на сайце цэнтра і яго старонках у сацсетках. Планецца, што дзеці ў вызначаны час будуць заходзіць на платформу, кантактаваць з важатымі, абмяркоўваць якія-небудзь тэмы, атрымліваць ад іх заданні. На працягу дня яны будуць іх выконваць, таксама падлеткі змогуць далучыцца да майстар-класаў і дыскусійных клубаў.

Наталля Апанчук паведаміла, што падчас летніх канікулаў ва ўсіх рэгіёнах будуць сфарміраваны валанцёрскія атрады па прафілактыцы каранавіруса. Зараз завяршаецца анлайн-праект #AntiCOVID-19, які праходзіў пры падтрымцы ЮНІСЕФ. Рэспубліканскі валанцёрскі цэнтр навучыў 100 валанцёраў і 120 каардынатараў валанцёрскага руху, як правільна і бяспечна арганізоўваць работу валанцёраў у такі складаны час.

Пры ўмове спрыяльнай эпідэміялагічнай сітуацыі валанцёры плануюць удзельнічаць у рэспубліканскім свяце «Александрыя збірае сяброў» і міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

Таксама моладзь працягне дапамагаць Чырвонаму Крыжу, тэрытарыяльным цэнтрам па працы і сацабароне, палікнікам, а таксама адрасна — ветэранам, якія маюць у гэтым патрэбу.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ХТО Б'Е Ў ЗВАНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Да нашага часу арыгінальных званоў не захавалася. Як расказала Юлія, яны былі страчаны падчас Першай сусветнай вайны. Ёсць гістарычныя даведкі, што з іх адлівалі гарматы і іншую зброю.

Дзесьці гадоў дваццаць сабор стаяў маўклівы. І ўсё ж прыхаджане не страчвалі надзеі вярнуць яму «голас». На ахвяраванні мясцовых жыхароў і знакамітых гараджан у 1935 годзе быў набыты першы, самы вялікі звон, вагой больш чым паўтары тоны. Яго прывезлі на цягніку з Польшчы. Дарэчы, на ім яшчэ выбіты прозвішчы самых значных фундатараў Гродна.

— Гэта Дабравеснік, ён задае рытм і тон усяму перазвону, ім упраўляюць з дапамогай педалі, — расказвае званарка Юлія. — А ўсяго ў нас дзесяць званоў. Самы стары 1885 года, ён выглядае даволі сціпла, яго шлях да гродзенскага сабора так і не ўдалося прасачыць, хутчэй за ўсё гэты звон прынёс нехта з прыхаджан.

Яшчэ чатыры невялікія званы куплены да стагоддзя сабора. Іх адлівалі, дарэчы, у Беларусі. Увогуле набываць званы няпроста, бо сама па сабе вытворчасць даволі складаная, а цяпер яшчэ і рэдкая.

— У нас сабраны, можна сказаць, шэдэўры ліцця 20—30-х гадоў мінулага стагоддзя. У той час якраз назіраўся росквіт рускай школы ліцця. І ў нас ёсць некалькі званоў знакамітых ліцейных заводаў. Ёсць званы польскай школы ліцця. Агульная вага нашага аркестра — больш за тры тоны, — кажа суразмоўніца.

## Дзінь-дзінь-бом...

Званы Свята-Пакроўскага сабора можна лічыць самымі гучнымі ў Гродне. Іх звон чуваць па ўсёй цэнтральнай частцы горада. Дарэчы, саборныя званы «агучваюць» і многія гарадскія мерапрыемствы, у першую чаргу, тыя, што праходзяць каля Вечнага агню. Але галоўная іх місія — суправаджаць важныя царкоўныя святы, а таксама сустракаць і праводзіць епіскапа Гродзенскага і Ваўкавыскага, які праводзіць службы ў галоўным кафедральным саборы Гродзенскай вобласці.

Што выказвае гэты звон? Юлія не на словах, а на справе дэманструе традыцыйны царкоўны звон. Атрымліваецца нешта накшалт дзінь-дзінь-бом, дзінь-дзінь-бом... Па словах званаркі, у праваслаўных храмах няма нейкай спецыяльнай мелодыі. Тут галоўнае — імправізацыя званара, яго пульс, тэхніка.

— Вядома, існуюць розныя віды звону. Інакш навошта вучыцца — калаці сабе як папала і ўсё. Але тут важна перадаць настрой. Нават з аднаго звона можна стварыць цэлы шэраг інтанацый. Раней так і было. Адзін звон рознымі тэмпамі перадаваў інфармацыю — прыезд госця, пажар, вайна, эпідэмія, усё гэта звон. З набыццём шэрагу званоў атрымлівалася больш меладычнае гучанне. Напрыклад, на богаслужэнне склікаў самы вялікі звон — Дабравеснік. Пасля службы — радасны і вясёлы перазвон. Людзі памаліліся і ачышчаныя ідуць са службы, — расказвае Юлія.

## Хто ў званары?

Дваццаць гадоў таму Юлія была ў ліку першых навучэнцаў Мінскай школы званароў, а з 2009 года ўжо і сама адкрыла ў Гродне пры Свята-Пакроўскім саборы падобныя курсы. Яна званар прафесійны, аб чым сведчыць і запіс у працоўнай кніжцы. Акрамя школы званароў, Юлія Мінчанка скончыла Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, факультэт мастацтва. І ўвогуле яна педагог у чацвёртым пакаленні. Генетыка і веды дапамагаюць ёй больш паглыблена будаваць свае заняткі з тымі, хто прыйшоў атрымаць навыкі званара.

— Вядома, добра, калі ў чалавека ёсць музычная адукацыя, тады ён лягчэй усправымае гэту навуку, — лічыць суразмоўніца. — Бо перыяд навучання не вельмі працяглы — усяго два месяцы. Да таго ж варта, каб чалавек быў неяк звязаны з царкоўным жыццём, інакш няма сэнсу. Як «чалавеку з вуліцы» потым выкарыстаць свае навыкі? Згадзіцеся, валодаць майстэрствам і не мець магчымасці скарыстацца ім — гэта сапраўдная гора, на мой погляд, гэта цяжка, бо ты носіш груз нявыказанасці. А калі ты валодаеш і можаш потым гэта прымяніць — атрымліваеш маральнае задавальненне.

Трэба сказаць, што ахвотнікаў набіраецца не вельмі шмат. Справа гэта сапраўды нялёгкая. Паколькі заняткі праходзяць кожны дзень, адчуваецца значная нагрузка на вушы, нават пры карыстанні бярушамі. Гэта яшчэ і фізічна цяжка — працаваць са шматтонным металам. Таму ў адным выпуску можа быць і два, і пяць чалавек. Юлія прыгадвае дзяўчыну, якая выдатна асвоіла гэту тэхніку і здала экзамен, хоць напатачку былі сумненні ў яе здольнасці. А некаторыя



хлопцы не вытрымліваюць, бо гэта для іх цяжка. Па словах Юліі, сэнс не ў тым, каб падрыхтаваць як мага больш званароў. Галоўнае, каб яны маглі займацца гэтай справай. Многія з «вучняў» ужо працуюць у храмах альбо маркуюць працаваць у тых, якія зараз будуюцца.

— Займаюцца людзі розных узростаў, але ў асноўным гэта праваслаўныя людзі, якія скіраваны на царпенне, жаданне авалодаць такім майстэрствам, — расказвае званар-педагог. — Шукаем магчымасці працаўладкаваць. Летась я вучыла прадстаўніка прыхода з мікраранёна Альшанка, і неўзабаве храму ахвяравалі званы. Так мой вучань набыў сваё «рабочае» месца.

«Выпускнікі» школы званароў служаць святарамі ў Свята-Успенскім Жыровіцкім манастыры, у тым ліку выпускнікі духоўнай семінарыі. Некаторыя з'яўляюцца настаяцелямі храмаў па-за межамі Беларусі. З тымі, хто пакуль не мае свайго прыхода, Юлія таксама не губляе сувязь, яна арганізуе для былых студэнтаў майстар-класы, каб яны не страчвалі навыкі і былі, што называецца, у прафесійнай форме.

— Цяпер будуецца нямала храмаў. З цягам часу там будуць набывацца і званы. Таму добра, калі ёсць гатовы званар. Бо бывае, храм і званы ёсць, а званара няма, — зазначае Юлія Мінчанка. — Настаяцелі храмаў, вядома, зацікаўлены, каб у іх быў свой званар і накіроўваюць чалавека на вучобу.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

### У тэму

**Існуе трывалае сцвярджэнне аб магічных сілах звону не толькі ў выгнанні «злых духаў», але і гаючых асаблівасцях супраць многіх хвароб і інфекцый. Нездарма вышэйшы орган Беларускай праваслаўнай царквы — сінод, у сваім звароце ў сувязі з пагрозай распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі дае, у тым ліку, рэкамендацыю здзяйсняць ва ўсіх храмах і манастырах штодзённы перазвон чатыры разы ў дзень да завяршэння пандэміі. Пры гэтым біць у вялікі звон 12 разоў, а затым на працягу 10 хвілін званіць ва ўсе званы. У гэты час царква заклікае вернікаў узносіць малітву аб спыненні шкоднай навалы.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,**<br>**г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «КУПАЛИНКА»,**<br>**Минская обл., г. Солигорск, ул. Заслонова, 58** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка»,**<br>**г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703.**<br>**Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Магазин «Кулинария»** (здание специализированное розничной торговли) общ. пл. 354 кв. м, инв. № 644/С-766, адрес: Минская обл., Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. К. Заслонова, д. 34А.<br>**Сведения о земельном участке**: предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатации магазина «Кулинария», общ. пл. 0,1363 га | |
| **Начальная цена (с НДС 20 %) – 715 680,00 бел. руб.** | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (**BYN**) перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001;** нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на счет: в долларах США (**USD**) – **BY76BLBB30120191021390001004** в евро (**EUR**) – **BY33BLBB30120191021390001002;** в российских рублях (**RUB**) – **BY22BLBB30120191021390001006** в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390 | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **4 %** от цены продажи предмета электронных торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 12.05.2020 | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | |
| Начало торгов: **11.00 18.06.2020**.<br>Окончание торгов: **12.00 18.06.2020**.<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок** | |
| Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 16.06.2020 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные данные** | **+375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06.**<br>**E-mail: auction@cpo.by** |

**Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «ГРОДНЕНСКИЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**

сообщает, что в извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Плодоовощсервис», который состоится **23 июня 2020 г.** внесены изменения на основании письма Доверителя.

Строку «Начальная цена продажи» следует читать: **422 280,0 рублей** (в т.ч. НДС 20 %).

Строку «Сумма задатка» следует читать: **42 228,0 рублей.**

УНП 590727594

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## НА СТРОИТЕЛЬСТВО ОБЪЕКТА

## «Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой со сносом здания по просп. Партизанскому, 71Б»

**ИНФОРМАЦИЯ О ЗАСТРОЙЩИКЕ**

**Застройщик:** ОАО «Минский домостроительный комбинат» зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей решением Мингорисполкома 14 февраля 2001 г. за № 100258980.

**Юридический (почтовый) адрес:** 220015, г. Минск, ул. Пономаренко, 43, телефон для справок: (017) 2072060, +375 (44) 7771158.

Прием заявлений и заключения договоров: понедельник – четверг с 8.15 до 16.30, обед с 12.00 до 12.45, пятница с 8.15 до 15.00, обед с 12.00 до 12.45.

В течение трех предшествующих лет ОАО «Минский домостроительный комбинат» в качестве Застройщика (заказчика) построены следующие объекты:

«16-этажный жилой дом по генплану № 12 в микрорайоне № 2 в границах улиц Шаранговича–Горецкого–Рафиева», ноябрь 2013 г. – август 2015 г.

«Многоквартирный жилой дом со встроенными административными помещениями по генплану № 13 в микрорайоне № 2 реконструируемой застройки в границах улиц Шаранговича, Горецкого, Рафиева (бывшая дер. Сухарево)», ноябрь 2014 – июнь 2016;

«Реконструкция застройки территории в районе улиц Михалова, Алибегова. Жилой дом № 13», апрель 2017 – апрель 2018;

«Многоквартирный жилой дом на ул. Серова на месте снесенного дома № 54» апрель 2019 г. – декабрь 2019 г.

**ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА**

Проект разработан ОАО «Институт «Минскгражданпроект.

**Результат государственной экспертизы проектной документации.**

Заключение государственной экспертизы (положительное): РУП «Главгосстройэкспертиза» № 425-15/17 от 12.09.2017 г. Заключение государственной экспертизы (положительное) № 213-15/20 от 21.05.2020 г.

Решение Мингорисполкома «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства» от 28.12.2018 г. № 5227.

Извещение о получении уведомления и регистрации объекта строительства Инспекции Госстройнадзора по г. Минску от 22 февраля 2019 г. № 03/51. Объект зарегистрирован 22 февраля 2019 года под № 2-201Ж-005/19.

Заказчиком и генеральным подрядчиком по строительству объекта выступает ОАО «Минский домостроительный комбинат».

**Сведения об этапах строительства и сроках его реализации.**

Начало строительства – февраль 2019 г. Предполагаемый Заказчиком срок ввода объекта в эксплуатацию – август 2020 года.

Земельный участок расположен в Заводском административном жилом районе г. Минска и граничит: с севера – с лесопарковой территорией парка 50-летия Октября, с западной и южной стороны – с жилой застройкой, с восточной стороны – с территорией Минского торгового колледжа.

Конструктивная схема дома представляет собой сочетание объемных конструктивно-планировочных модулей (ОКПМ) и плоскостных элементов внутренних стен и перекрытий.

Проектом предусмотрено строительство 11-этажного, 2-секционного, 98-квартирного жилого дома с подземной гараж – стоянкой. Высота жилого этажа – 2,8 м.

В жилом доме запроектированы 1-, 2-, 3-комнатные квартиры. Общая площадь однокомнатных квартир от 48,97 $м^2$ до 50,71 $м^2$, двухкомнатных квартир от 66,34 $м^2$ до 67,23 $м^2$, трехкомнатных квартир 99,70 $м^2$.

В каждой секции запроектировано по два лифта (пассажирский и грузопассажирский).

В подземном гараже-стоянке запроектировано 70 машино-мест общей площадью от 11,30 $м^2$ до 18,30 $м^2$.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые, вентиляционные и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых и (или) нежилых помещений, но обеспечивающее их жизнедеятельностью.

Строительство Объекта будет осуществляться в соответствии с заключенными договорами создания объектов долевого строительства (далее – договоры) с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в г. Минске, при предъявлении справки о постановке на учет нуждающихся в улучшении жилищных условий (**со сверкой данных**). Справка действительна в течение 30 календарных дней с даты выдачи.

Объект долевого строительства сдается в эксплуатацию без выполнения чистовых отделочных работ.

Для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в г. Минске, при предъявлении справки о постановке на учет нуждающихся в улучшении жилищных условий (**со сверкой данных**) для заключения договоров, предметом которых будет строительство жилого помещения и машино-места в подземном паркинге предлагается 70 квартир.

Стоимость строительства 1 $м^2$ нормативной площади квартиры (с ограниченной прибылью) 1725 белорусских рублей

Стоимость строительства 1 $м^2$ общей площади квартиры, превышающей нормативную, – 2350 белорусских рублей.

Ограниченная прибыль устанавливается в пределах нормативной площади, которая составляет 15 $м^2$ в г. Минске на дольщика, а также на каждое лицо, состоящее на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий и осуществляющее строительство объекта долевого строительства совместно с дольщиком (при строительстве для одного человека однокомнатной квартиры – 30 кв. метров).

70 парковочных мест в подземном паркинге общей площадью от 11,30 до 18,30 $м^2$. Стоимость строительства 1 $м^2$ общей площади парковочного места в подземном паркинге 2700 белорусских рублей.

Окончательная цена объекта долевого строительства определяется в договоре с учетом поэтажного расположения квартиры и стоимости машино-места.

Для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в г. Минске, при предъявлении справки о постановке на учет нуждающихся в улучшении жилищных условий (**со сверкой данных**) для заключения договоров предлагается 26 квартир, предметом которых будет строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 $м^2$ нормативной площади квартиры (с ограниченной прибылью) 1725 белорусских рублей.

Стоимость строительства 1 $м^2$ общей площади квартиры, превышающей нормативную, – 2350 белорусских рублей.

Окончательная цена объекта долевого строительства определяется в договоре с учетом поэтажного расположения квартиры.

Оплата первоначального взноса в размере 30 % от цены договора осуществляется в течение 7 календарных дней с даты регистрации договора в Мингорисполкоме. Остальные выплаты по договору осуществляются ежемесячно в соответствии с графиком платежей до 30 сентября 2020 года включительно.

**Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве.**

Заключение договоров с дольщиками осуществляется в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 06.06.2013 года № 263 «О долевом строительстве объектов в Республике Беларусь.

Принятие и регистрация заявлений потенциальных дольщиков о заключении договоров осуществляется отделом собственного строительства ОАО «Минский домостроительный комбинат» через 5 календарных дней после опубликования проектной декларации, с 11 июня 2020 года, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 понедельник – четверг с 8.15 до 16.00, обед с 12.00 до 12.45, пятница с 8.15 до 15.00, обед с 12.00 до 12.45.

Запись и бронирование квартир по телефону не осуществляется, электронные заявления не регистрируются.

Для подачи заявления гражданину, состоящему на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, необходимо личное присутствие гражданина, паспорт (ксерокопия паспорта стр. 25, 31, 33), справка администрации района г. Минска о постановке на учет нуждающихся в улучшении жилищных условий **со сверкой данных.**

Заключение договоров создания объектов долевого строительства будет осуществляться через 7 календарный дней непосредственно с гражданами подавшими заявление либо с их представителями, действующими по доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ОАО «Минский домостроительный комбинат» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим гражданином.

# Извещение о проведении 19 июня 2020 года повторных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7»

**ПРЕДМЕТ ТОРГОВ**

Капитальное строение с инв. № 500/С-59 (наименование – здание кафе с конференц-залом, площадь – 1029,8 кв. м, составные части и принадлежности: площадка (литер а), проезд (литер б), площадка под склад (литер в), дорожка (литер г), дорожка (литер д), дорожка (литер е), площадка под мусоросборники (литер з), эстакада (литер к), въезд (литер л), ограждение (литер м), ограждение (литер н), ограждение (литер о), ворота распашные (литер п), ворота откатные (литер р), ворота распашные (литер с), бордюр 0,08 (литер т), бордюр 0,16 (литер у)), расположенное по улице Селицкого,115/1 в городе Минске; капитальное строение с инв. № 500/С-30562 (наименование – проходная З 1/К, площадь – 20,0 кв. м), расположенное по улице Селицкого,115/2 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-7058487 (наименование – гараж, площадь – 1 235,0 кв. м), расположенное по улице Селицкого,113-2 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793112 (наименование – помещение неустановленного назначения (вент. камера), площадь – 96,6 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-13 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793076 (наименование – помещение многофункциональное, площадь – 1 076,3 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-14 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-708114019 (наименование – производственное помещение, площадь – 144,6 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-15 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-708114020 (наименование – административное помещение, площадь – 15,8 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-15а в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-708124027 (наименование – административное помещение, площадь – 920,0 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-16 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-708124028 (наименование – помещение неустановленного назначения, площадь – 176,2 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-16а в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793079 (наименование – помещение неустановленного назначения, площадь – 27,7 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-17 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793081 (наименование – помещение неустановленного назначения, площадь – 13,8 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-19 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793082 (наименование – помещение неустановленного назначения, площадь – 42,9 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-20 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793083 (наименование – помещение стоматологии, площадь – 49,3 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-21 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793084 (наименование – административное помещение, площадь – 17,3 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-22 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-707947946 (наименование – помещение здравоохранения, площадь – 14,9 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-23 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793086 (наименование – административное помещение, площадь – 16,0 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-24 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793087 (наименование – административное помещение, площадь – 32,6 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-25 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793088 (наименование – помещение санитарно-бытового назначения, площадь – 12,8 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-26 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793089 (наименование – административное помещение, площадь – 15,7 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-27 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793090 (наименование – административное помещение, площадь – 31,1 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-28 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793091 (наименование – административное помещение, площадь – 30,5 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-29 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793092 (наименование – административное помещение, площадь – 14,3 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-30 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793099 (наименование – административное помещение, площадь – 152,4 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-37 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793100 (наименование – административное помещение, площадь – 40,4 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-38 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793105 (наименование – административное помещение, площадь – 14,4 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-43 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793106 (наименование – административное помещение, площадь – 16,4 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-44 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793107 (наименование – административное помещение, площадь – 32,4 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-45 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793108 (наименование – административное помещение, площадь – 32,9 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-46 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793109 (наименование – административное помещение, площадь – 31,6 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-47 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793110 (наименование – помещение неустановленного назначения, площадь – 251,0 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-48 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-70793111 (наименование – помещение неустановленного назначения, площадь – 102,7 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-49 в городе Минске; изолированное помещение с инв. № 500/D-707947947 (наименование – помещение стоматологии, площадь – 30,0 кв. м), расположенное по улице Селицкого, 113А-50 в городе Минске; капитальное строение с инв. № 500/С-1019226 (наименование – ливневая канализационная сеть, протяженность сети – 833,1 м), расположенное по улице Селицкого, 113 (от ЛК-сущ, до ЛК-46) в городе Минске; капитальное строение с инв. № 500/С-1019229 (наименование – тепловая сеть, протяженность – 165,3 м), расположенное по адресу: внутриплощадочная тепловая сеть по улице Селицкого, 113 в городе Минске; капитальное строение с инв. № 500/С-1019230 (наименование – сеть наружного освещения, протяженность – 458,1 м), расположенное по улице Селицкого, 113 в городе Минске; капитальное строение с инв. № 500/С-1019228 (наименование – хозяйственно-фекальная канализационная сеть, протяженность – 944,1 м), расположенное по улице Селицкого, 113 (КК-1-КК-39 (сущ.) в городе Минске; капитальное строение с инв. № 500/С-1019227 (наименование – хозяйственно-питьевая водопроводная сеть, протяженность – 833,1м), расположенное по улице Селицкого, 113 (от ВК-сущ, до ВК-2) в городе Минске;

водомерный узел (инв. № 6500, 2010 года выпуска), задвижка с электроприводом (инв. № 131033, 2005 года выпуска), задвижка с электроприводом (инв. № 131032, 2005 года выпуска), насос ВРН 60/250 40м (инв. № 1416, 2004 года выпуска), шкаф гардеробный с антресолью 2500*2100*560 (инв. № 2004, 2010 года выпуска), шкаф гардеробный с антресолью 2500*2300*600 (инв. № 01038, 2009 года выпуска), шлагбаум WIL6/A в комплекте (Селицкого) (инв. № 47074, 2012 года выпуска);

дерево (алыча) инв. № 010, дерево (алыча) инв. № 011, дерево (алыча) инв. № 012, дерево (алыча) инв. № 013, дерево (береза повислая) инв. № 015, дерево (боярышник обыкновенный) инв. № 016, дерево (ель колючая голубая) инв. № 017, дерево (ель колючая голубая) инв. № 018, дерево (ель колючая голубая) инв. № 019, дерево (ель колючая голубая) инв. № 020, дерево (ель колючая голубая) инв. № 021, дерево (ель колючая голубая) инв. № 022, дерево (ель колючая голубая) инв. № 023, дерево (робиния лжекация) инв. № 026, дерево (робиния лжекация) инв. № 025, дерево (слива домашняя) инв. № 028, дерево (слива домашняя) инв. № 029, дерево (слива домашняя) инв. № 027/ (далее – имущество).

**Местонахождение: г. Минск, ул. Селицкого, 113, 113А, 113-2, 115/1, 115/2**

Сведения о земельных участках:
кадастровый номер 500000000002009190, площадь – 0,3308 га (доля в праве аренды: 2/5);
кадастровый номер 500000000002009194 площадь – 1,8216 га

Начальная цена: 1 655 405,22 бел. руб. с учетом НДС

Сумма задатка: 165 000,00 бел. руб.

Обременение: аренда

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, тел. (017) 507-61-83.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **19 июня 2020 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 08.06.2020 по 17.06.2020** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 507-61-83 (ОАО «ДСТ № 7»).**

# Кухня з відам на сцяну

**Жыхары трох шматпавярховых дамоў у адным з двароў па вуліцы Савецкай у Рэчыцы вось ужо больш чым паўгода спрабуюць высветліць лёс зялёнай зоны пад вокнамі іх кватэр. Пасля запланаванай рэканструкцыі крамы, што прыбудавана да жылога дома, ад дваровай тэрыторыі мала што застанецца, упэўнены мясцовыя жыхары.**





Маці чатырох дзяцей Алена Ляшчова ідзе на другі паверх дома ў сваю кватэру, што набыла ў складчыну з усёй раднёй для малодшай дачкі — цяпер і самой маладой маці. Прапусціўшы гасцей у кватэру, жанчына вядзе на кухню. Праз акно ўказвае на галоўны мінус кватэры: гэта дах прыбудовы, якая праграваецца ў спякоту і «жарыць» у шкло яе акна. Да таго ж і від з кухні — сцяна крамы.

Прыбудову зрабіў некалькі гадоў таму прадпрымальнік, які спачатку выкупіў кватэру на першым паверсе і вывеў яе з жылфонду. Потым узяў дазвол у Рэчыцкім райвыканкаме, каб да сцяны сваёй «былой кватэры» прыбудаваць, так бы мовіць, адмысловы «флігель». У гэтай прыбудове адкрылі краму бытавой хіміі. Менавіта пахі не давалі спакою жыхарам кватэры на другім паверсе. Аднак летась да гэтага ж дома зноў сталі праяўляць інтарэс індывідуальныя прадпрымальнікі — як да магчымай гандлёвай кропкі.

— У кастрычніку 2019 года мы атрымалі ліст з райвыканкама, што ў сувязі з будаўніцтвам гаспадарчыя пабудовы ў нашым двары будуць знесены, — тлумачыць Алена Яўгенаўна. — Мы дамагліся сустрэчы з прадпрымальнікам, хоць дакладна нават не ведалі, гэта ён будаваць плануе, ці не. Ён нам паказаў план рэканструкцыі, а там такі размах!.. Наша кватэра, напрыклад, будзе абкладзена дахамі з усіх бакоў.

Алена Ляшчова ўжо не хавае эмоцыі і са слязамі на вачах працягвае расказваць, што адразу, як даведаліся пра будучую забудову, жыхары двухпавярховіка склалі калектыўны зварот у райвыканкам, прасілі прыняць пад увагу, што ўмовы пражывання і карыстання дваровай тэрыторыяй будуць пагоршаны. Суседка Алены Яўгенаўны — Валянціна Маўчанава — заклікае нас выйсці ў двор. Пачула, што будзе карэспандэнт і таксама просіць слова:

— Я ў гэтым двары нарадзілася і вырасла. Да апошняга часу вось праз гэты праход, што заняла першая прыбудова да акна колішняй кватэры, быў уваход у двор.

Яна гаворыць, што таксама звярталася ў раённую адміністрацыю і пісала, што праз брамку, якую зрабілі для жыхароў іх дома з другога іх боку пасля першай рэканструкцыі, цяпер ходзяць усе, хто трымае курс да крамы. А яшчэ ж няма новай прыбудовы!

— У нас двор — быццам забягалаўка для распіцця напояў — зацішак такі, якраз для вячэрніх пасядзелак аматараў выпіць.

Жанчыны звяртаюць увагу: па плане, які для іх раздрукаваў прадпрымальнік, будучая прыбудова дойдзе якраз да вокнаў кватэры на першым паверсе і ўшчыльную — да ўваходных дзвярэй у пад'езд. Дарэчы, згодна з планам прыбудова — 200 квадратных метраў. Дзе яе размесцяць у гэтым сціплым па памеры двары, жанчыны не могуць зразумець.

Тым часам Валянціна Уладзіміраўна працягвае: дом збудаваны ў 1958-м, некалі з пячным ацяпленнем, без ванных пакояў, балконаў, туалетаў. Умовы палепшылі ў 70-х гадах мінулага стагоддзя.

— Нам у адным з адказаў пісалі, што пасля рэканструкцыі нашага дома з'явіцца сацыяльны аб'ект, — узрушана суседка. — Але ці так гэта? У горадзе дастаткова месцаў, дзе можна пабудаваць краму ці нават гандлёвы цэнтр. Калі ласка, развівайце прадпрымальніцтва. Чаму гэта трэба рабіць у жылым доме, каб наогул пазбавіць людзей хоць малюсенькага, але свайго спакойнага двара?

І вось ужо ў двор, як на сход, высыпала яшчэ некалькі жанчын. Высвятляецца, гэта даўнія актывісты супраць ушчыльняльнай забудовы двара. Яны жывуць у суседнім доме. Кажуць, што ў 2015 годзе дабіваліся адмены будаўніцтва гандлёвага пункта, што побач. Жанчыны ўказваюць на двухпавярховую краму, якая ўзвышаецца і стаіць ушчыльную да маленькай прыбудовы, што каля дома Алены Ляшчовай і Валянціны Маўчанавай.

— Мы не можам нават уявіць, куды ў наш двор яшчэ можна ўпіхнуць тую «квадратуру», што прадпрымальнік зацвердзіў у сваім праекце, — абураецца цяпер Алена Ставіцкая. — Калі будавалі гэтую першую двухпавярховую краму пяць гадоў таму, то нам казалі, што ў двары будзе разваротная пляцоўка для аўтамабіляў. Але ў нас тут кругласутачная паркоўка выйшла. Мы акно не адкрываем нават у спякоту летам, бо тавар прывозяць разгружаць, потым паркуюцца наведвальнікі.

Калі іх двор перажыве яшчэ адну перабудову, то пляцоўка пад разварот прасунецца далей уздоўж іх дома.

— Мы напісалі ліст у райвыканкам з просьбай растлумачыць нам, што тут будзе адбывацца, як наогул перакрыюць двор і заезд у яго, калі новая забудова ўсё перакрые, — кажа Алена Аляксандраўна. — Я хадзіла асабіста, узялі мой тэлефон, абяцалі даць адказ, пакуль цішыня.

Цяпер ужо другая жыхарка суседняга дома — Наталля Міхальчанка — не вытрымлівае і пачынае з горыччу расказваць, якія ўвогуле прывабны быў калісьці іх агульны двор:

— Тут, дзе паставілі першую двухпавярховую краму, быў кляновы сквер, а за нашым домам, насупраць гэтага маленькага старога двухпавярховіка — яблыневы сад. Калі пяць гадоў таму наш двор аблюбавалі для забудоў пад гандлёвыя пункты, мы ад нашага дома сабралі 90 подпісаў супраць будаўніцтва, ад суседняга дома 70. Звярталіся ў райвыканкам, аблвыканкам, нават пісалі ў Мінск. Адтуль далі на рэагаванне зноў Гомелю, і мы атрымалі адказ, што крама тут вельмі патрэбна гараджанам. Што было рабіць. Цяпер новая навала...

Да кагорты жанчын падыходзіць маладая дзяўчына. Маўляў, ведае, аб чым размова, таму не мае права абмінуць спантанны сход і не выказаць сваё меркаванне. Кажа, што вырасла ў гэтым доме, двор заўсёды быў вельмі ціхі і ўтульны, цяпер — прахадны. Паставілі плот і брамку для жыхароў дома, але яе часта ўзломваюць.

Некаторыя з жанчын прынеслі паперы з адказамі ад адміністрацыі райвыканкама на іх калектыўныя звароты. Да апошняга часу ў мясцовых была надзея на рэакцыю ў межах грамадскага абмеркавання. Падчас яго многія дасылалі свае лісты з абурэннем наконт забудовы ў іх двары.

— Нас палохае і насцярожвае тое, што перад пачаткам грамадскага абмеркавання нам абяцалі правесці прэзентацыю праекта новай прыбудовы да дома, — бярэ слова Алена Ляшчова. — Нічога не зрабілі, хоць прызначылі сустрэчу на май і пэўную дату вызначылі яшчэ ў канцы красавіка. 12 мая людзі сабраліся і, як кажуць, «пацалавалі дзверы», ніхто не папярэдзіў, што ўсё адмяняецца з-за эпідэміялагічнай сітуацыі.

Між тым, як высветлілася, сам прадпрымальнік — суб'ект гаспадарання — растлумачыў па тэлефоне, што нават не ведаў аб негатыўным стаўленні жыхароў да запланаванай забудовы ў двары. Па яго словах, усе дакументы ўзгоднены належным чынам, ёсць афіцыйнае рашэнне і дазвол на рэканструкцыю яго папярэдняга будынка, што ён узвёў паміж двухпавярховымі домам і крамай.

У Рэчыцкім райвыканкаме сітуацыю з будаўнічымі планамі ў двары на цэнтральнай вуліцы растлумачыў **намеснік старшыні Яўген ЮРЧАНКА.** Гэта за яго подпісам жыхары пералічаных двароў атрымалі адказы на свае звароты:

— Суб'ект гаспадарання, які набыў кватэру на першым паверсе дома па вуліцы Савецкай, вывеў яе з жылфонду, потым падаў заяву на будаўніцтва крамы. Цяпер уласнік гандлёвага аб'екта плануе пашырацца і пабудаваць прыбудову.

Яўген Васілевіч звяртае ўвагу на тое, што двор у цэнтры горада — гэта вельмі зручнае месца для развіцця гандлю. Тым больш што гэтыя дзве крамы, пабудаваныя побач з домам, — двухпавярховая з асартыментам абутку і маленькая з бытавой хіміяй — карыстаюцца вялікім попытам у гараджан:

— Што датычыцца новай прыбудовы ў дваровай частцы, то пасля грамадскага абмеркавання будзе працаваць над гэтым пытаннем горадабудаўнічы савет. Яго роля — улічыць усе заўвагі-прапановы, вызначыць найлепшае рашэнне, каб усім было зручна. У канчатковым варыянце будуць захаваны ўсе ўмовы для камфортнага асяроддзя, якія, дарэчы, прапрацоўваюцца праектным інстытутам.

Таксама прадстаўнік Рэчыцкага райвыканкама звярнуў увагу на тое, што суб'ект гаспадарання прапанаваў за свой кошт зрабіць новую гаспадарчую пабудову для жыхароў дома, у якім няма склепа. Бо падчас забудовы прыйдзецца знесці стары драўляны хляўчук у цэнтры двара.

Жыхары вераць, што могуць яшчэ адстаяць свае правы, бо будаўніцтва пагаршае ўмовы іх жыцця і карыстання агульнай дваровай тэрыторыяй. Між іншым, яны могуць скарыстаць сваё права падаць калектыўную іскавую заяву ў суд.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

## Чалавек — чалавеку

# ПРОСТЫ САКРЭТ ШЧАСЦЯ

**Мая двухгадовая дачушка кантактуе з бабулямі па відэасувязі. І кожны раз, калі чуе іх звычнае «Як справы?», нязменна адказвае: «Сё добa!» (чытай — «Усё добра!»), а вось у мяне...**

Нам, згадзіцеся, больш звычна скардзіцца: сяброўцы — на мужа, калегам — на дырэктара, маці — на долю (хоць часам — такую ж кожнаму!). Прыгадайце, калі вы дзяліліся радасцю, калі некага ці нешта хвалілі? Я, напрыклад, большую частку жыцця лічыла, што нельга так рабіць, пакуль не знойдзеш да чаго прыдрацца. Маўляў, класныя ў цябе чаравікі, але ж, мусіць, не мыюцца?

Бо яно ж не бывае, каб усё раптам добра?

А ў дачушкі маёй — бывае.

Не, у мяне зрэдчас таксама: і настрой трымаецца, і надвор'е радуе... А спытай хто: «Ну як ты?» «Добра, — адкажу, — але ж там баліць, там рыпіць і спакою не дае...»

Гэта — каб не сурочыць? Ці каб не зайздросцілі?.. Ды хто ж яго ведае — для чаго.

Сяброўка скардзіцца, што не можа радавацца дзецям, бо заўважае ў іх толькі адмоўнае. Напісала першакласніца цэлы радок прыгожых закавычак, а яна там бачыць толькі адну — тую, што «з'ехала» ўніз... Сын букет бэзу ўручыў — насварылася, што прыроду губіць.

Муж яшчэ кветкі не дорыць. Намякнула — не зразумеў, сказала наўпрост: «Хачу...»

Прынёс, падарыў — не тыя. Не так аддаў, не тое сказаў і наогул: «Я хацела рамантычны вечар, а ты ўсё сапсаваў».

...«Вялікі набытак — быць пабожным і задаволеным», — піша апостал Павел свайму любаму вучню Цімафею. У гэтых словах не чалавечая мудрасць, а Божая. Быць задаволеным — просты сакрэт шчасця.

...Дачка ўжо гадзіны са дзве чакае з работы тату. І вось званок у дзверы — бяжыць, пішчыць: «Ура, тата!..» — «Не, кажу, гэта дастаўка — дзядзька прадукты прывёз».

Малая нават выраз твару не змяніла: «Ура! Дзядзечка дастаўшчык! Прадукты прывёз!»

Я вучуся ў дачкі. І сяброўцы раю: змяняй фокус, прымушай сябе хваліць дзяцей, заўважаць добрае. А там, глядзіш, — і само пойдзе. Гэта ж звычка. Як і наракаць.

«Заўсёды радуйцеся. Бесперастанку маліцеся, — піша апостал Павел. — За ўсё дзякуйце...»

Заўважылі — не за добрае, а за ўсё. За зіму без снегу, за халодную вясну, за сумнае дзяцінства, нелюбімую работу, неразумную жонку. За хатнюю ізаляцыю...

Дзякаваць — не значыць пакідаць так, як ёсць. Дзякаваць — прызнаваць, што менавіта гэта зараз патрэбна. Каб думаць, чаму яно так сталася і што да гэтага прывяло. Каб выцягнуць урокі, выпраўляць памылкі. Каб не апускаць рукі.

Каб быць задаволеным і рухацца далей.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА,**
*г. Мінск.*

## Пошук

### Чалавек не знікае так, бы ў кішэні вякоў пятак...

**Праўду кажуць: хто не ведае свайго мінулага, той не мае і добрай будучыні**

Дзеля гэтай вось памяці наша раённая арганізацыя ветэранаў вырашыла афарміць стэнд «Першыя сакратары Старадарожскага райкама партыі», у пошуку патрэбных матэрыялаў звярнуцца ў архівы. У выніку вельмі шмат што ўдалося зрабіць. Адзінае, чаго пакуль не змаглі, — не адшукалі здымак Давіда Карпавіча Краўчанкі. Ён працаваў у нас першым сакратаром з 1948 да 1950 года, а нарадзіўся ў 1902-м у вёсцы Блізняцы Рагачоўскага раёна.

Магчыма, недзе там, на Гомельшчыне, засталіся яго сваякі ці нашчадкі. Можа быць, нехта з чытачоў шаноўнай «Звязды» дапаможа нам адшукаць патрэбныя здымкі?

**І. С. Грыб, старшыня раённай арганізацыі ветэранаў,**
*г. Старыя Дарогі.*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**

## Мікалай ІЗВОЛАЎ:

# «На маёй памяці адкрыццё такога маштабу здарылася ўпершыню»

**ГЭТА была сенсацыя: у 2018 годзе на прэстыжным кінафестывалі IDFA ў Амстэрдаме былі паказаны страчаны фільм Дзігі Вертава — хлопца з Беластока, савецкага рэжысёра, кінаавангардыста, які лічыцца заснавальнікам, тэарэтыкам і амаль што богам дакументальнага кіно. Прычым не проста фільм, а самы яго першы фільм — «Гадавіна рэвалюцыі», — зроблены і паказаны ў 1918 годзе. То-бок публіка зноў убачыла карціну роўна праз сто гадоў, ды яшчэ з такім візуальным матэрыялам, каштоўнасць якога сёння складана вымераць, усё ж дакумент часу. Стужкі Вертава, у прыватнасці «Чалавек з кінаапаратам», — што Біблія для дакументалістаў, без работ рэжысёра не абыходзяцца спісы найвялікшых фільмаў свету, яго эксперыменты паўплывалі на ўсю гісторыю кіно. Таму не дзіўна, што «Гадавіна» сабрала безліч аншлагаў у маштабным рэйдзе па кінафестывалях і чатыры тыдні пратрымалася ў камерцыйным пракаце ў Маскве, што нядрэнна нават для сучасных ігравых стужак. А ўзнавіў фільм маскоўскі кіназнаўца, архівіст і рэстаўратар кіно Мікалай Ізволаў, і зрабіць гэта яму дазволіла абсалютная і шчаслівая выпадковасць. Сёння «Гадавіну рэвалюцыі» можна паглядзець у анлайн-кінатэатрах Okko і «КінаПошук», і пад гэтую справу мы распыталі Мікалая аб рабоце над фільмам, «Гадавіне» і Вертаве.**


Фота Аляксандра МЕХАНОШЫНА.

***— Каб гледачы маглі зноў убачыць «Гадавіну рэвалюцыі», трэба было не проста знайсці згублены фільм, а літаральна сабраць яго па кавалках. Узнікае пытанне, наколькі добра захаваўся архіў савецкага кіно?***

— Праблема захаванасці ранніх фільмаў ва ўсіх краінах прыкладна аднолькавая: як у СНД, так і ў Еўропе і ЗША загінула каля 80 % нямога кіно. Кінавытворчасць была прыватная, а прыватныя арганізацыі банкрутуюць, перапрадаюць правы, знікаюць — ніхто не захоўваў плёнкі, якія выйшлі з ужытку. Толькі калі з'явіліся дзяржаўныя архівы, фільмы сталі збірацца — у Савецкім Саюзе такі архіў (ён існуе да сённяшняга дня) быў арганізаваны ў 1926 годзе ў Краснагорску, таму савецкія дакументальныя карціны — дзіўная справа — захаваліся нават лепш, чым у іншых краінах. У свеце архівы часцей з'яўляліся ў канцы 1930-х альбо ўжо пасля Другой сусветнай, так што ранняе гукавое кіно таксама моцна пацярпела. Але кіно гіне і на нашых вачах: многае, напрыклад, было страчана пасля распаду Савецкага Саюза, таму кіно 90-х захавалася горш, чым кіно 80-х.

***— Калі знаходкі накшталт першага фільма Вертава дагэтуль магчымыя, значыць, архівы вывучаныя не да канца.***

Ёсць і метады самадапамогі ў такіх выпадках. Хочацца выпіць — паешце: страўнік з цяжкасцю ўспрымае алкаголь, калі чалавек ужо сыты. Пасля насычэння жаданне выпіць зніжаецца. Яшчэ, калі вы адчулі жаданне выпіць, трэба паспрабаваць адкласці час ужывання алкаголю, напрыклад, на заўтра.

Калі ўсё ж не атрымліваецца сабе дапамагчы, трэба прымаць рашэнне звяртацца да спецыялістаў. Справа ў тым, што чалавек, у якога сфарміравалася залежнасць, можа сысці ў запой, з якога без прафесійнай дапамогі медыкаў выйсці без шкоды для здароўя проста не атрымаецца.

— Шкоду арганізму прыносяць прадукты распаду алкаголю, — тлумачыць спецыяліст. — Калі пасля ўжывання спіртнога хочацца пахмяліцца, то гэта ўжо запой. Пасля яго непазбежны стан адмены алкаголю, які бывае ўскладнёны або неўскладнёны, — у народзе яго называюць «адхадняк». Ён адрозніваецца ад звычайнага пахмелля і патрабуе медыцынскага ўмяшання. Чалавека, у якога не сфарміравалася залежнасць, будзе ванітаваць ад адной думкі пра ўжыванне алкаголю падчас пахмелля, а чалавек са сфарміраванай залежнасцю будзе хацець выпіць яшчэ, бо ведае, што яму стане лягчэй. Але гэта падман. Лягчэй стане на пару гадзін, але калі гэты час пройдзе, будзе яшчэ горш.

Чалавек у запоі ўжо не можа выконваць свае звычайныя штодзённыя абавязкі, з'яўляюцца праблемы на рабоце і ў сям'і. Адбываецца нібыта выключэнне з жыцця — пакуль не скончыцца алкаголь або грошы. І тады арганізм заявіць пра сябе хранічным атручваннем, якое суправаджаецца паражэннем унутраных органаў і нервовай сістэмы. З дапамогай медыкаў з запою, як правіла, выходзяць за некалькі гадзін, часам можа спатрэбіцца некалькі сутак — усё залежыць ад цяжкасці стану. Сам жа чалавек з запою не выйдзе, бо для гэтага неабходны рэцэптурныя медыкаменты. Пасля выхаду трэба звярнуцца да спецыялістаў, якія дапамогуць справіцца з ужо сфарміраванай залежнасцю.

Сёння ў краіне існуе шмат арганізацый, якія дапамагаюць залежным людзям. Напрыклад, таварыства ананімных алкаголікаў Беларусі падчас пандэміі не спыняе сваю работу. У гэтай арганізацыі больш за 90 груп па ўсёй краіне.

Звярнуцца па дапамогу можна ананімна па тэлефоне. Галоўная ўмова — жаданне кінуць піць.

— Цяпер падчас пандэміі многія сышлі ў самаізаляцыю, і нашы сустрэчы часта праходзяць анлайн, — кажа Алена, удзельніца групы ананімных алкаголікаў. — Калі ёсць жаданне, мы прапануем чалавеку прыйсці на сход, але можна пагаварыць і па тэлефоне. Мы працуем па праграме 12 крокаў пераадолення залежнасці. Тыя, хто прайшоў свае 12 крокаў, дзеляцца досведам з іншымі. Так мы дапамагаем адно аднаму.

Алена лічыць, што сітуацыя з каранавірусам, калі людзі прымаюць рашэнне самаізалявацца, дапамагае ім убачыць, ці ёсць у іх праблемы з алкаголем. Жанчына кажа: самае цяжкае — прызнацца самому сабе ў тым, што праблема з алкаголем узнікла. Але яна ўпэўнена, што залежнасць — не прысуд і з ёй можна жыць, калі выконваць пэўныя правілы.

Канешне, лягчэй па-ранейшаму працягваць жартаваць і ўжываць алкаголь для «дэзынфекцыі». Галоўнае — праз такія жарты не сфарміраваць у сябе сур'ёзную залежнасць.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**


ТЕХНОБАНК

Открытое акционерное общество
220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44

Открытое акционерное общество «Технобанк» настоящим уведомляет акционеров о принятии внеочередным Общим Собранием акционеров ОАО «Технобанк» 28.05.2020, протокол № 6, решения о крупных сделках, о праве акционеров требовать выкупа акций в случаях, установленных законодательством Республики Беларусь. Для реализации своего права требовать выкупа акций акционеру необходимо представить в письменном виде в ОАО «Технобанк» по адресу: 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44, соответствующее заявление произвольной формы на имя Председателя Правления ОАО «Технобанк» в течение 30 дней со дня проведения Общего Собрания акционеров, на котором было принято решение, повлекшее возникновение права требовать выкупа акций (28.05.2020). ОАО «Технобанк» по результатам рассмотрения поданных заявлений с требованиями о выкупе акций в течение 70 дней с даты поступления заявления в банк удовлетворяет требования акционеров либо в течение 30 дней сообщает акционерам об отказе в удовлетворении требований акционеров.

При необходимости получения дополнительной информации обращаться в ОАО «Технобанк» по адресу: 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44 в любое удобное время с 11.00 до 15.00 (кроме выходных и праздничных дней), с предъявлением документов, удостоверяющих (подтверждающих) личность и полномочия.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь
на осуществление банковской деятельности № 11 от 03.05.2019, УНП 100706562

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «МЭТЗ ИМ. В. И. КОЗЛОВА», г. Минск, ул. Уральская, д. 4, каб. 502** |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение:**
**Минская обл., Логойский р-н, Швабский с/с, 21 (район д. Молоди)**

**База отдыха Молоди** в составе: **корпус № 1 базы отдыха** (945,6 кв. м, 601/С-26310, составные части: проезды и площадки), **корпус № 2 базы отдыха** (902 кв. м, 601/С-26315), **склад для хранения материалов** (28,8 кв. м, 601/С-26317), **склад** (152,3 кв. м, 601/С-24453), **сеть водопровода** (1082,74 м, 601/С-29058), **сети канализации с септиком** (960,62 м, 601/С-29057), **кабельная линия КЛ-0,4 кВ** (916,4 м, 601/С-27840), иное имущество (можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by)**

**Сведения о земельном участке**: пл. **3,4989 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений базы отдыха

**Начальная цена с НДС – 231 520,80 бел. руб.** (снижена на 40 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликованы в газете «Звязда» от 21.04.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время проведения аукциона: 23.06.2020 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 22.06.2020 до 17.00** по указанному адресу

**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор электронный торгов:**
ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703

**Продавец:** ОАО «Завод «Легмаш», Витебская обл., г. Орша, пер. Восточный, 17

**Оператор ЭТП:**
ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46

**Адрес ЭТП:** www.ipmtorgi.by

**Предмет электронных торгов:**
**Недвижимое имущество, расположенное по адресу:**
Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Ивана Якубовского, 75-137

| Лот № | Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| 1 | **Магазин встроенный (административно-торговое помещение мазазин встроенный)** | 368 кв. м | 240/D-36384 |
| **Начальная цена с НДС 20 %: 185 760,00 белорусских рублей BYN** | | | |
| **Недвижимое имущество, расположенное по адресу:** Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Ивана Якубовского, 75-138 | | | |
| 2 | **Выставочный зал «Лань» расположен на 1-2 этаже (административно-торговое помещение выставочный зал «Лань»)** | 534,4 кв. м | 240/D-36385 |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 265 680,00 белорусских рублей BYN** | | | |

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов **www.cpo.by**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронный торгов перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 30 (тридцать) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Предыдущее извещение о проведении аукционов опубликованы в газете «Звязда» 20.05.2020 г.**

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет электронных торгов с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

**Дата, место и время проведения электронных торгов**
**Начало торгов – 11.00 18.06.2020 г. Окончание торгов – 12.00 18.06.2020 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата, место и время окончания приема документов:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по 17.06.2020 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06 E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

Клопат

# СЛОВА — НА ВАГУ ЗОЛАТА

## Як працуюць сельскія сацыяльныя работнікі падчас пандэміі

**Загадчыца 2-га аддзялення хатняй сацыяльнай дапамогі Кобрынскага тэрытарыяльнага цэнтра Таццяна ШАСТАК спяшалася ў райцэнтр: «Ужо трэці раз буду атрымліваць сродкі аховы і дэзынфекцыі ў раённай арганізацыі таварыства Чырвонага Крыжа, — кажа Таццяна Мікалаеўна. — Ён нам вельмі дапамагае: маскі, пальчаткі, антысептык нашы супрацоўнікі атрымліваюць рэгулярна. Вядома, клапоцімся і пра сваіх падшэфных, і пра супрацоўнікаў».**

### Спецыфіка эпідсітуацыі

Таццяна Шастак узначальвае другое аддзяленне, якое знаходзіцца ў Дзівіне, былым райцэнтры, а цяпер паўднёвым населеным пункце на мяжы з Украінай. Сваім клопатам сацыяльныя работнікі гэтага аддзялення ахопліваюць больш за 260 чалавек. Падшэфныя пражываюць у дзевяці вёсках Дзівінскага і Павіццеўскага сельсаветаў.

У аддзяленні зараз працуе 45 сацыяльных работнікаў, якія дапамагаюць састарэлым, хворым людзям. У рабоце гэтай службы на сяле ёсць свае асаблівасці, таму што падшэфныя жывуць часцей у вясковых хатах без зручнасцяў, з пячным ацяпленнем. Работы па іх абслугоўванні больш, да таго ж трэба ўлічыць, што адлегласць паміж дамамі, а то і населенымі пунктамі часта вельмі нават адчувальная. Таму сацработнікі маюць меней падшэфных, чым іх гарадскія калегі.

А цяпер і спецыфіка работы крыху змянілася. Паводле слоў Таццяны Шастак, некаторыя падшэфныя, праінструктаваныя гарадскімі дзецьмі, не хочуць камунікаваць са староннімі людзьмі. Ім цяпер толькі прадукты і лекі дастаўляюць пад дзверы дома. Ёсць адмысловая сістэма стасункаў, калі сацыяльны работнік прыносіць пакет з прадуктамі, пакідае на ганку, забірае грошы за пакупку ў схованцы. Але такіх пенсіянераў меншасць. Большая частка, наадварот, сумуе па стасунках з людзьмі, бо родныя сталі наведваць радзей, унукаў не пускаюць пагасціць да бабуль. А пажылым людзям хочацца пагаварыць, абмяняцца думкамі, пачуць пра вясковыя навіны. Даводзіцца падстройвацца.

### Прыборка, абед і экскурсія

Сацработнік Наталля Данілюк мае зараз сем чалавек на абслугоўванні.

— У маёй рабоце амаль нічога не змянілася, — расказвае Наталля Уладзіміраўна. — Мае бабулькі мяне не баяцца, у дом пускаюць, усю работу і па доме, і ў двары раблю, як раней. Ну і вядома, у магазіны, аптэку хаджу для іх. Адзінае, што папрасіла зрабіць кожную з іх, пакласці каля ўмывальніка кавалак гаспадарчага мыла. Па-мойму, найлепшы антысептык з прывычных мыйных сродкаў. Калі прыходжу ў дом, найперш старанна мыю рукі з гэтым мылам і прыступаю да работы. Вядома, карыстаюся маскай. Работы хапае. Ну, напрыклад, адзін з маіх падшэфных — 90-гадовы Афанасій Мікітавіч Гапановіч, вядомы ў Дзівіне чалавек. Настаўнік-пенсіянер займаецца краязнаўчай работай, напісаў некалькі кніг пра нашу вёску. Усё жыццё Афанасій Мікітавіч працаваў у школе. Дзеці жывуць далёка. Ужо даўно ветэран пражывае адзін. Вядома, дзеці да сябе клічуць. І ўжо нібы збіраўся ў канцы мінулага года пераехаць да дачкі ў Піцер. Але паехаў, крыху пабыў там і запатрабаваў везці дадому. Бо там сядзець у кватэры чалавеку, які прывык хадзіць па зямлі, няхай сабе і ў сваім двары, аказалася цяжкім выпрабаваннем. Гэта яшчэ Афанасій Мікітавіч прыехаў своечасова, да ўсялякіх ускладненняў сітуацыі, каранцінаў і перабояў з транспартам... Хаджу да яго тры разы на тыдзень, забіраю бялізну памыць, добра, што ў нас у аддзяленні ёсць пральня. У хаце прыбіраю, нешта абавязкова есці прыгатую, — гаворыць Наталля.



Загадчыца аддзялення Таццяна Шастак забяспечвае сродкамі дэзынфекцыі сацыяльнага работніка Наталлю Данілюк.

Цяпер пажылы чалавек нікуды не выходзіць самастойна. Але ж яму вельмі цікава, як у Дзівіне ідзе падрыхтоўка да абласных дажынак, бо ў пасёлку як ніколі шмат робіцца па добраўпарадкаванні, рамонце, абнаўленні. «Бачу, як цікаўнаму па характары чалавеку хочацца пабачыць усё на свае вочы, пабываць у прывычных для яго мясцінах. Часам пасаджу яго ў сваю машыну, правязу па асноўных аб'ектах, пакажу, дзе што абнаўляецца, вось дзядуля і задаволены», — усміхаецца Наталля.

### У доме зімоўкі і ў замяшчальнай сям'і

Павел Брыштэн — адзіны мужчына ў жаночым калектыве дзівінскіх сацработнікаў. Ужо пяць гадоў ён паспяхова працуе ў гэтай галіне, і кіраўніцтва аддзялення атрымлівае толькі падзякі ад яго падшэфных. Зараз на абслугоўванні ў Паўла пяць бабулек, усе жывуць у вёсцы Павіцце.

— Мае падшэфныя мяне чакаюць, як і раней, — кажа Павел. — Кожнай трэба дапамагчы па дамашняй гаспадарцы, прынесці неабходныя прадукты, тавары, лекі. Я ім удзячны яшчэ і за тое, што пажылыя людзі вельмі адказныя і паслухмяныя. У гэтую няпростую пару нікуды не выходзяць з дому, лішні раз не сустракаюцца, нават на лавачцы блізка не сядзяць. Ды і іншыя аднавяскоўцы захоўваюць сацыяльную дыстанцыю, не збіраюцца, як раней у чэргах у краме, іншых сацыяльных установах. Усё гэта і ёсць патрэбныя меры перасцярогі, пра якія мы не стамляемся нагадваць пажылым людзям.

Павел Брыштэн дапамагае таксама Васіліне Раманаўне Герасімік у яе доме зімоўкі. Такі адмысловы дом па падказцы сацыяльнай службы арганізавалі ў Павіцці. На зіму сыходзяцца дзве пенсіянеркі, а дакладней, да Васіліны Раманаўны перабіраецца Ганна Арсенцеўна Жук. Удзвюх ім лягчэй ладзіць хатнюю гаспадарку, паліць у печы, гатаваць ежу. Ды і эканомія адчувальная: дроў, брыкету трэба нарыхтоўваць на адзін дом. А цяпер такая форма пражывання людзей, як знаходка. Калі кола іх зносін са знешнім светам абмяжоўваецца, дзвюм жанчынам значна весялей, чым адной. Ды і сацыяльныя работнікі Павел Брыштэн і Таццяна Любчук рэгулярна прыходзяць, дапамагаюць.

У Павіцці ёсць таксама замяшчальная сям'я. Алена Шапяцюк, маці траіх дзяцей, узяла ў сям'ю інваліда першай групы Алену Якаўлеўну Шапяцюк. Жанчыны не сваячкі, проста цёзкі па прозвішчы. 50-гадовая інвалід невідушчая, раней яе даглядалі сваякі, а калі іх не стала, Алене Якаўлеўне «свяціла» толькі сацыяльная ўстанова, бо сябе яна абслугоўваць належным чынам не можа. «Мы рэгулярна наведваем гэту сям'ю, — гаворыць **інспектар па асноўнай дзейнасці аддзялення Вольга РАМАНЮК,** — і бачым, якім клопатам акружыла прыёмная гаспадыня падшэфную. Там усё добра».

Дзівінскім сацыяльным работнікам істотна дапамагае ў рабоце пральня, якая некалькі гадоў таму з'явілася ў аддзяленні. Цяпер і генеральную ўборку ў доме падшэфных стала правесці лягчэй. Можна за адзін раз памыць коўдры, пакрывалы, шторы. Пажылыя людзі аддаюць пасцельную і сталовую бялізну. Цэны на паслугу сацыяльныя. Гэты цэх яшчэ і зарабляе паслугамі, што аказвае іншым арганізацыям. Напрыклад, на лета дагавор на мыццё бялізны заключыў дзіцячы лагер адпачынку.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Кобрынскі раён.*

Ідэі і рашэнні

# КНІГА, ЯК КУБАЧАК КАВЫ,

## або Чым прыцягваюць чытачоў бібліятэкі Мінскай вобласці

**Што бадзёрыць не горш, як кубачак кавы? Задушэўная размова з прыемным чалавекам, пасля якой цяжка заснуць. Але, калі ў вас ёсць цікавы суразмоўнік, то вам пашанцавала. А што рабіць, калі няма падыходзячага кандыдата? Гэта падстава не засмучацца, а акунуцца ў цудоўны свет кніг. Так лічыць загадчыца Цімкавіцкай сельскай бібліятэкі, што ў Капыльскім раёне, Вольга РАДКЕВІЧ.**

Падчас пандэміі каранавіруса не кожны рызыкне наведаць грамадскую ўстанову, асабліва пажылыя людзі, хоць тут і прадугледжаны неабходныя меры бяспекі. Даводзіцца самім ісці да чытачоў. Напрыклад, выкарыстоўваць сацыяльныя сеткі для прэзентацыі новых выданняў. А ўсіх ахвотных, пенсіянераў абслугоўваць дома. У прыватнасці, работнікі бібліятэкі па заяўцы чытачоў дастаўляюць ім неабходную літаратуру. Да справы падключыліся і сацыяльныя работнікі.

Менавіта часовыя цяжкасці прымушаюць думаць на перспектыву, шукаць новыя падыходы, каб захаваць і пашырыць кола чытачоў. У прыватнасці, на лета запланаваны такі праект, як «Бібліятэка на траве». Гэта своеасаблівая зона культурнага адпачынку, якую могуць наведаць і дарослыя, і дзеці. Тут яны могуць пачытаць любімую кнігу. Малыя — пагуляць з мяккімі цацкамі, якія сабралі для іх бібліятэчныя работнікі, іх бацькі — паспаборнічаць у шашках, шахматах, паўдзельнічаць у майстар-класах.

— Разам з тым мы не адмовіліся і ад традыцыйных мерапрыемстваў, — кажа Вольга Уладзіміраўна.

Пацвярджэнне таму выстаўка-інсталяцыя «Эпохі дарожнага чытання», якая прадстаўлена ў некалькіх цыклах. Напрыклад, 1940—1960-я — у даваенны драўляны чамадан складзены тагачасныя газеты, у тым ліку і «Звязда», а таксама «Кніга карысных парад» для хатніх гаспадынь, мастацкая літаратура. 1970—1990-я — у чамадане савецкіх часоў сабраны перыядычныя выданні гэтых гадоў, кнігі, зборнік вершаў Сяргея Ясеніна, песеннік, народныя казкі і шмат іншага. Цыкл 2000-я — гэта наша сучасная белетрыстыка, яркія часопісы, сканворды... і магніцікі на памяць аб месцах наведвання. Экспанаты выстаўкі папаўняюцца. Рарытэтамі дзеляцца землякі.

— У нас ёсць сайт, дзе змяшчаем усю інфармацыю, анонсы мерапрыемстваў. Мае калегі вядуць старонкі ў сацыяльных сетках. Аднак ладзім і мерапрыемствы ўжывую, але не такія масавыя, як раней,— кажа **дырэктар Мінскай раённай цэнтральнай бібліятэкі, што ў аграгарадку Міханавічы, Аксана ПУНІНСКАЯ.** — Нядаўна адкрывалі дзіцячую бібліятэку. І, вядома, такая радасная падзея не адбылася без юных грамадзян. Аднак яны былі ў масках, размешчаны кропкава, на адлегласці.

Па словах Аксаны Ільінічны, у маі наведвальнікаў паменшала, але цяпер людзі зноў пайшлі ў бібліятэкі, у тым ліку і школьнікі, на час летніх канікул ім выдалі спісы дадатковай літаратуры. Адкрываюцца і дзіцячыя аздараўленчыя лагеры, якія таксама абслугоўваюць работнікі бібліятэк.

Разам з тым бібліятэчныя ўстановы Міншчыны сталі больш актыўна выкарыстоўваць бескантактавыя формы работы з чытацкай аўдыторыяй. Напрыклад, Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя Анатоля Астрэйкі пазнаёміла чытачоў з новымі выданнямі пра Вялікую Айчынную вайну з дапамогай віртуальнай выстаўкі «Каб памяць была жывая». Наведвальнікі сайта даведаліся пра партызанскі рух, герояў мінулай вайны, спаленыя вёскі, жахі канцэнтрацыйнага лагера «Азарычы». А ў сярэдзіне мая стартаваў новы праект — сямейны марафон «Ланцужок добрых слоў». Удзельнікі дасылаюць на электронную пошту фотаздымкі, відэаролікі, віншаванні, прысвечаныя міжнародным святам: Дню сям'і, Дню абароны дзяцей, Дню бацькі. Закончыцца марафон 8 ліпеня ў дзень Святых Пятра і Фяўроніі, якія сталі заступнікамі сям'і і шлюбу.

Даспадобы чытачам прыйшоўся і флэшмоб «Чытаем дома», які правяла ў сацыяльных сетках Маладзечанская раённая цэнтральная бібліятэка. Усе ахвотныя фатаграфаваліся з любімай кнігай і публікавалі здымак у каментарыях пад запісам бібліятэчнай установы.

Шмат цікавага прапануе чытачам і Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка. У прыватнасці, цікавасць выклікала віртуальная выстаўка-памяць «Чытайце навінкі», «Чытаем кнігі мясцовых аўтараў» і іншыя праекты.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# АДНОЙЧЫ Ў АМЕРЫЦЫ

## ЗША захліснула хваля масавых пратэстаў

**Больш чым 10 тысяч чалавек затрымана з пачатку масавых пратэстаў, якія праходзяць у ЗША. Пра гэта паведаміла агенцтва Associated Press. Больш за чвэрць усіх затрыманняў прыпадае на Лос-Анджэлес (штат Каліфорнія). Далей ідуць Нью-Ёрк, Далас (штат Тэхас) і Філадэльфія (штат Пенсільванія). Шмат каму з затрыманых прад'яўленыя абвінавачанні ў здзяйсненні дробных правапарушэнняў, напрыклад у невыкананні правілаў каменданцкай гадзіны. Пры гэтым, як адзначыла Associated Press, сотні пратэстоўцаў арыштаваныя паводле абвінавачанняў у крадзяжы або марадзёрстве. У барацьбе з беспарадкамі да мясцовых праваахоўных органаў часта падключаецца Нацыянальная гвардыя ЗША, задзейнічана каля 30 тысяч байцоў у больш чым 30 штатах і сталічнай акрузе Калумбія. Прыкладна ў 40 гарадах, уключаючы Вашынгтон і Нью-Ёрк, уведзена каменданцкая гадзіна. Як ЗША пераадольваюць глабальную хвалю беспарадкаў?**

### КАМЕНДАНЦКАЯ ГАДЗІНА

Беспрэцэдэнтныя па маштабе беспарадкі ў ЗША пачаліся на мінулым тыдні ў Мінеапалісе пасля смерці Джорджа Флойда. Цемнаскуры стаў ахвярай празмерна жорсткіх дзеянняў паліцыі. Пратэсты ў Мінеапалісе пачаліся на наступны дзень пасля смерці Флойда. Праз дзень незадаволеныя выйшлі на вуліцы Лос-Анджэлеса, затым акцыі ахапілі ўсю краіну. Убаку не засталіся і найбуйнейшыя гарады краіны Нью-Ёрк і Вашынгтон. У сталіцы дэманстранты прыйшлі да Белага дома.

Першапачатковыя акцыі былі мірныя: людзі проста выйшлі выказаць сваю незадаволенасць у вопратцы і масках з надпісам «Я не магу дыхаць». Менавіта гэтыя словы паўтараў Флойд, калі на яго шыю ціснуў нагой паліцэйскі. На вуліцах сабраліся і прыхільнікі руху Black Lives Matter («Жыцці чорных маюць значэнне»), які выступае супраць гвалту ў дачыненні да чарнаскурага насельніцтва. Больш радыкальна настроеныя дэманстранты скарысталіся момантам: яны білі шкло ў паліцэйскіх участках і патрульных машынах. Затым будынкі і аўтамабілі пачалі падпальваць, гэта адбывалася не толькі ў Мінеапалісе, але і ў іншых гарадах. Агрэсіўна настроеныя ўдзельнікі акцый без разбору грамілі чужую ўласнасць і збівалі людзей, якія спрабавалі яе абараніць. Амерыканцы азіяцкага паходжання нават вырашылі аб'ядноўвацца і абараняцца ад марадзёраў, засеўшы на дахах са зброяй.

Лос-Анджэлес, Вашынгтон, Маямі, Дэтройт, Філадэльфія, Атланта, Сіэтл, Чыкага, Пітсбург, Мінеаполіс і многія іншыя мегаполісы адзін за іншым аб'яўлялі забарону на вулічныя дэманстрацыі ў начны час. А губернатары некалькіх штатаў, уключаючы Тэхас і Вірджынію, увялі надзвычайнае становішча. Як удакладняе Reuters, апошні раз каменданцкую гадзіну ў ЗША прыходзілася ўводзіць гэтак масава больш за 50 гадоў таму — пасля забойства Марціна Лютэра Кінга-малодшага ў 1968-м.

Зрэшты, як мірныя пратэстоўцы, так і вандалы ўсё роўна заставаліся на вуліцах нават уначы. Мэр акругі Калумбія Мюрыэл Баўзер у сувязі з тым, што адбываецца, заявіла: людзі маюць права на свабоду сходаў, аднак не павінны пры гэтым разбураць горад — падпалы былі зафіксаваныя і ў Вашынгтоне. На вуліцы для барацьбы з беспарадкамі вывелі не толькі паліцэйскіх, але і сілы Нацыянальнай гвардыі — фарміраванні рэзерву, арганізаваныя арміяй і ваенна-паветранымі сіламі. Іх запрасілі для дапамогі больш за 25 штатаў. Паліцэйскія ў першыя дні пратэстаў дзейнічалі акуратна, часта стараліся перачакаць у ачапленні. У некаторых выпадках яны ўжывалі слёзатачывы газ і гумавыя кулі для разгону натоўпу. Аднак калі дзеянні пратэстуючых сталі больш жорсткімі, вартавыя парадку пачалі масава арыштоўваць дэманстрантаў. У Атланце, напрыклад, двое паліцэйскіх былі звольненыя пасля грубага затрымання навучэнцаў каледжа. Сярод арыштаваных у выхадныя ў найбуйнейшым горадзе ЗША аказалася і дачка мэра Нью-Ёрка Біла дэ Блазіа К'яра.

### «БЛУКАЮЦЬ СТАТКІ ГОБЛІНАЎ»

Нярэдка прыходзяць паведамленні пра параненых і загінулых падчас пратэстаў. Пацярпелыя ёсць як сярод паліцэйскіх, так і сярод дэманстрантаў. Амерыканскія ўлады падкрэсліваюць, што любыя сутычкі з паліцыяй і пагрозы праваахоўнікам будуць расцэньвацца як акты ўнутранага тэрарызму. Пры гэтым многія адзначаюць, што мірныя пратэстоўцы і завадатары цяперашніх беспарадкаў — розныя людзі. Па інфармацыі паліцыі, за хваляй гвалту стаяць групы прыхільнікаў тэорыі аб перавазе белай расы, анархісты, крайне левыя экстрэмісты і антыфашысты.

Па словах начальніка паліцыі Маямі Хорхе Коліна, з 57 чалавек, затрыманых падчас беспарадкаў у адзін з дзён, толькі 13 мясцовых жыхароў. Аб каардынацыі падобных знешніх сіл заяўляла і мэр Чыкага Лоры Лайтфут. Яна адзначыла, што марадзёрства было добра арганізавана, прычым верагодна, людзьмі з іншых рэгіёнаў: «Грузавікі чароўным чынам з'яўляліся перад крамамі, караваны машын высаджвалі людзей, якія разбівалі вокны і выносілі тавары».

У ЗША марадзёрства называюць «луцінгам» (англ. looting). Акрамя таго, словам «лут» геймеры называюць унутрыгульнявыя каштоўнасці, якія атрымліваюцца пасля забойства праціўнікаў або пры захопе іх тэрыторыі. Тыдзень таму прэзідэнт ЗША Дональд Трамп апублікаваў у сваім Twitter спрэчны пост на гэтую тэму, у якім ужыў фразай: «Калі пачынаецца марадзёрства, пачынаецца стральба» (англ. «When the looting starts, the shooting starts»). Словы амерыканскага лідара — гэта цытата кіраўніка паліцыі Маямі Уолтара Хэдлі. Праваахоўнік зрабіў такую заяву ў 1967 годзе падчас расавых хваляванняў у горадзе. Хэдлі заклікаў сілавікоў выкарыстоўваць жорсткія меры ў адносінах да актывістаў. Калі прэзідэнта ЗША сталі вінаваціць у расізме ў сувязі з выкарыстаннем гэтага выказвання, ён паведаміў, што не ведаў аб паходжанні гэтай фразы: «Я не ведаю, адкуль яна ўзялася».



Нягледзячы на пагрозы Трампа, марадзёры не спыняліся. Прычым яны не баяцца выкарыстоўваць фізічны гвалт. Пра гэта расказаў расійскі фігурыст Аляксей Краснажон, які цяпер жыве ў горадзе Далас у Тэхасе. «У нас у Даласе была гісторыя, як мужык выйшаў абараняць ад пагромшчыкаў свой бізнес. Яго збілі ледзь не ўдзесяцёх. Людзі руйнуюць жыццё нявінным, гэта неправільна. У мяне няма бізнесу, але ёсць бейсбольная біта. Калі пратэсты дабяруцца да майго дома, я гатовы», — паведаміў суразмоўнік выданню «Спорт-экспрэс».

Пагромы дагналі дарагія буцікі і нават непрыметныя супермаркеты ў дзясятках гарадоў ЗША: у Нью-Ёрку, Лос-Анджэлесе, Сан-Францыска і многіх іншых населеных пунктах. Удзельнікі акцый выносілі з крамаў рэчы і дэбош здзяйснялі пад лозунгам «Eat the rich!» («Еш багатых!»), пішуць амерыканскія СМІ. На сценах будынкаў, дзе размешчаны дарагія крамы, з'яўляліся надпісы накшталт «Багатыя больш не ў бяспецы!». Лозунг «Eat the rich!» — узыходзіць да антыкапіталістычнай песні Aerosmith пад такой жа назвай — заўважалі ў многіх месцах Business Insider і іншыя выданні. У прыватнасці, фраза была напісана чырвонай фарбай з балончыка на бялюткім Mercedes-Benz, які стаяў пасярод раскурочанага аўтасалона ў Оклендзе.

Па словах відавочцаў, марадзёрствам займаліся не толькі тыя, хто сапраўды мае патрэбу ў грашах або перажывае з-за гібелі Флойда. «Народ з'ехаўся рабаваць крамы з усіх навакольных штатаў. Была куча машын з Нью-Джэрсі, Пенсільваніі і нават з Мэна дабраліся. Упершыню ўбачыў рабаўнікоў на дарагіх тачках. Людзі пад'язджалі на «мерседэсах» за 100 тысяч долараў і зусім спакойна ішлі браць вопратку, залазячы ўнутр праз пабітыя вітрыны і набіваючы таварам салон і багажнік. Нават тое, што ім было не трэба, усё роўна білі, ламалі і крышылі: арт-галерэі, касметыку, кафэ, тавары для жывёл і ўсё астатняе, што траплялася па дарозе», — расказаў на сваёй старонцы ў Facebook пецярбуржац Дзяніс, які працуе гідам у Нью-Ёрку, паведаміла gazeta.ru.

Гэта пацвярджаюць і карэнныя амерыканцы. «Палова гэтых людзей нават не жыве тут. Яны тут, каб знішчаць рэчы. Гэта не дапамагае іх справам», — абурылася 68-гадовая жыхарка Каліфорніі Ана Пепе, паведамляе газета Los Angeles Times. Акрамя таго, марадзёры аб'ядноўваліся ў групы — каб было прасцей рабаваць. «Па вуліцах блукаюць статкі гоблінаў, якія захапілі Манхэтэн і працягваюць яго рабаваць. Ходзяць вялікімі натоўпамі або маленькімі групамі, і яны проста ўсюды. Фактычна ўвечары і ноччу на вуліцах толькі яны і копы», — дадаў гід Дзяніс. Злачынцы не баяліся атакаваць і банкі: напрыклад, у ноч на 1 чэрвеня ў прыгарадзе Сан-Дыега ў Каліфорніі зламыснікі абрабавалі і падпалілі два банкі, паведаміў Fox News.

### У ЧАКАННІ ЎСПЫШКІ

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп паабяцаў увесці ўзброеныя сілы ў штаты, дзе адбыліся найбольш маштабныя пратэстныя акцыі, якія могуць быць справакаваныя смерцю афраамерыканца Джорджа Флойда. Пра гэта амерыканскі лідар заявіў у сваім звароце з Ружовага саду Белага дома. «Я мабілізую ўсе існуючыя федэральныя рэсурсы, грамадзянскія і ваенныя, каб спыніць беспарадкі і марадзёрства, пакласці канец разбурэнням і падпалам і абараняць правы законапаслухмяных амерыканцаў», — падкрэсліў амерыканскі лідар, выступаючы ў Белым доме.

Справа ў тым, што федэральны Закон аб паўстаннях (Insurrection Act) ад 1807 года дазваляе прэзідэнту ЗША ў асобых абставінах выкарыстоўваць узброеныя сілы і перадаследуючы ў федэральнае падначаленне Нацыянальную гвардыю ўнутры краіны для падаўлення грамадзянскіх беспарадкаў, паўстанняў і мяцяжоў. Гэты закон ужо не раз прымяняўся для падаўлення маштабных беспарадкаў у сучаснай гісторыі Амерыкі, у тым ліку ў 1967 годзе ў Дэтройце, у 1968-м — у Чыкага і Балтыморы, а таксама ў 1992-м падчас пагромаў у Лос-Анджэлесе.

Вось і на гэтым тыдні ў сталічную Капіталійскую акругу перакінулі 1600 байцоў арміі з Форт-Брэгг у Паўночнай Караліне. Яны знаходзіліся каля пад'езда да Вашынгтона, але ў сам горад не ўвайшлі. У Вашынгтон і яго прыгарады таксама было накіравана прыкладна 1,7 тысячы байцоў Нацыянальнай гвардыі ЗША з штатаў Індыяна, Тэнэсі і Паўднёвая Караліна. Праўда, днямі міністр абароны ЗША Марк Эспер адмяніў вывад з раёнаў пабліз у амерыканскай сталіцы ваенных, якія былі перакінутыя туды для магчымай дапамогі ў падтрыманні парадку падчас пратэстаў. Пра гэта паведаміла агенцтва Associated Press са спасылкай на міністра арміі (сухапутных войскаў) ЗША Раяна Макарці.

Таксама стала вядома, што акрамя былога паліцэйскага Дэрэка Шовіна абвінавачанні былі прад'яўлены яшчэ тром праваахоўнікам, якія былі на месцы здарэння. Такім чынам, як адзначае Associated Press, пратэстоўцы дабіліся выканання сваіх патрабаванняў. Поўныя вынікі ўскрыцця цела Флойда былі апублікаваны са згоды сям'і. У дакуменце сказана, што ён памёр у выніку спынення сэрца, выкліканага сілавымі прыёмамі, якія былі выкарыстаны паліцэйскімі пры яго затрыманні. Адзначаецца, што ў крыві Флойда былі выяўлены сляды наркатычных рэчываў. У яго таксама быў дыягнаставаны COVID-19.

Пратэсты ў ЗША неаддзельныя ад эканамічнага крызісу, у якім апынуліся Злучаныя Штаты Амерыкі з-за пандэміі. Аб гэтым заявіў Дэрык Гамільтан, выканаўчы дырэктар Інстытута Кірвана пры Універсітэце штата Агаё, паведамляе выданне Business Insider. За апошнія тры месяцы больш за 40 мільёнаў амерыканцаў падалі заявы на дапамогу па беспрацоўі. Такім чынам, без работы застаўся фактычна кожны чацвёрты жыхар ЗША працаздольнага ўзросту. Пры гэтым больш за ўсё звальненняў у сектарах з традыцыйна нізкім узроўнем заробатнай платы. Сітуацыю пагаршае і тое, што 31 ліпеня для мільёнаў амерыканцаў мінае тэрмін дзеяння дапамогі па беспрацоўі. Скарачэнне федэральнай дапамогі можа выклікаць новую хвалю пратэстных акцый у краіне.

Галоўны хірург ЗША доктар Джэрам Адамс папярэдзіў аб тым, што варта чакаць новыя ўспышкі каранавіруса на фоне масавых пратэстаў. У інтэрв'ю Politico ён заўважыў, што «ёсць усе падставы чакаць, што мы ўбачым новыя кластары і, магчыма, новыя ўспышкі ў будучыні». Як лічыць губернатар штата Мінесота Цім Уолз, «нас чакае рэзкі скачок COVID-19». Так што ад хвалі пратэстаў да ўспышкі каранавіруса — адзін крок.

**Захар БУРАК.**

• **Даслоўна**

### Закладнікамі сітуацыі з сутыкненнямі сталі простыя людзі

Такое меркаванне выказаў старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй САВІНЫХ у эфіры АНТ.

На яго думку, цяпер у ЗША можна назіраць канфлікт дзвюх эліт, але фактычна за іх ваююць цемнаскурыя, лацінаамерыканцы, інтэлігенцыя. «Яны проста з'яўляюцца гарматным мясам гэтага сутыкнення», — адзначыў парламентарый.

«Адна элітная група, глабальны фінансавы алігархат, ваюе з алігархатам ваенна-прамысловым, вытворчым. Яны сышліся ў вельмі жорсткай, я сказаў бы, сутычцы на выжыванне. Гэта ўпершыню», — лічыць Андрэй Савіных. На яго думку, арганізацыя масавых пратэстаў у розных гарадах ЗША мае вельмі магутнае фінансаванне. Акрамя таго, праводзіцца інфармацыйная кампанія ў сацыяльных сетках і сродках масавай інфармацыі. Яшчэ адна асаблівасць — удзел вядомых асоб.

Парламентарый лічыць, што ў Амерыцы зараз можна назіраць класічны прыклад, калі эліты адной краіны сыходзяцца ў жорсткім супрацьстаянні. «Прычым відавочна, што амерыканскія эліты, групоўкі, якія супернічаюць адна з адной, ужо перайшлі пункт незвароту. Гэта значыць, што дамовіцца яны ўжо не змогуць. Упэўнены, што гэтыя беспарадкі — толькі пачатак. Калі скончацца беспарадкі з гэтай нагоды, праз 2-3 тыдні паўстане новая нагода, і будзе яшчэ новы віток дэстабілізацыі, новы віток беспарадкаў», — мяркуе Андрэй Савіных.

## ООО «Фрондера» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Забашевичи»

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 1088, 1983 г. п. общей площадью 222,00 кв. м, назначение – здание специализированное для производства строительных материалов, наименование – здание РБУ (растворо-бетонный узел) | Республика Беларусь, Минская обл., Борисовский р-н, Лошницкий с/с, в районе аг. Лошница | 19 481,60 | 1948,16 | 974,08 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 1043, 1975 г. п. общей площадью 402,5 кв. м, наименование – здание очистных сооружений | Республика Беларусь, Минская обл., Борисовский р-н, Лошницкий с/с, в районе аг. Лошница | 31 414,08 | 3141,41 | 1570,70 |
| 3 | Капитальное строение с инв. № 42841, 1987 г. п. общей площадью 448,0 кв. м, наименование – здание АВМ | Республика Беларусь, Минская обл., Борисовский р-н, Лошницкий с/с, в районе аг. Лошница | 28 735,36 | 2873,54 | 1436,77 |

**Лот 1** расположен на земельном участке с кадастровым номером 620884500001000845, площадь земельного участка – 0,1614 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания РБУ (растворо-бетонный узел), имеется ограничение (обременение) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь – 0,0191 га. Право аренды сроком до 10.02.2069. **Лот 2** расположен на земельном участке с кадастровым номером 620884500001000847, площадь земельного участка – 0,1207 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания производственного здания очистных сооружений. Право аренды сроком до 10.02.2069. **Лот 3** расположен на земельном участке с кадастровым номером 620884500001000844, площадь земельного участка – 0,1167 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания АВМ. Право аренды сроком до 10.02.2069

В отношении Лотов 1–3 проводятся первые торги.

**Начало приема заявлений – в 10.00 06.06.2020 г. Окончание приема заявлений – в 16.00 06.07.2020 г. по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121**

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник явился для участия в аукционе, и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затрат по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

**Вознаграждение аукциониста – 5 % от конечной цены предмета торгов.**

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 07.07.2020 в 12.00 (регистрация участников с 11.30 до 12.00) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121**

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://orgtorg.by/info/.

До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000** в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: «Задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Забашевичи» (Лот №__), проводимом 07.07.2020 г.». **Срок внесения задатка: с 10.00 06.06.2020 г. по 16.00 06.07.2020 г.**

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.

По вопросу ознакомления с предметом торгов обращаться по телефону +375 29 862 80 48 (Лекарев Василий Иванович).

Дополнительная информация по предмету торгов, по телефону +375 29 308 28 97 (Анаида).

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», Указа Президента Республики Беларусь № 63 от 05.02.2013 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)», Указа Президента Республики Беларусь от 04.07.2016 № 253 «О мерах по финансовому оздоровлению сельскохозяйственных организаций».

При реализации НДС не начисляется на основании подп. 2.30.2 ст. 115 Налогового кодекса Республики Беларусь (Особенная часть) от 29.12.2009 № 71-З.

**Государственная регистрация договора купли-продажи осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, Республика Беларусь, г. Минск, улица Мележа, д. 1, офис 1121, ☎ +375 29 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |
| **Продавец** | **ОАО «Забашевичи», 222117, Минская обл., Борисовский р-н, Гливинский с/с, аг. Забашевичи, тел. +375 17 772 71 12 в лице управляющего – ООО «ПрофДМ», 220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-27, • +375 17 395 89 17** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 07 июля 2020 года торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | Здание «Административно-бытовых и вспомогательных помещений МАЗ по ул. Машиностроителей» общей площадью 12 555,8 кв. м. (инвентарный номер в ЕГРНИ 500/U-63596, назначение: здание административно-хозяйственное); инженерные сети (общие затраты); теплотрасса; наружные сети ливневой канализации; наружные сети фекальной канализации, наружные сети водопровода; ограждение АБК АЗ; благоустройство; логотип «ЗУБР»; система ПТО ПТ 7637; монорельс ПТ 7735; монорельс ПТ 7648; кран подвесной мод. ПТ 6946-03.00.000 (5 шт.); шкаф ШРС 1-26 |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, пр-т Партизанский, 154А |
| **Сведения о земельном участке** | площадь – 2,3887 га, кадастровый номер 500000000002009005, назначение – земельный участок для обслуживания незавершенного законсервированного капитального строения |
| **Продавец имущества** | ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск |
| **Организатор торгов** | государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов с учетом НДС** | 12 137 230,56 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 1 210 000,00 бел. руб. |
| **Условие торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

